

Калі музыка — не толькі забава

СТАР. 3



У чым прычына рэдкіх захворванняў?

СТАР. 5



Калі муж гуляе ў машынкі...

СТАР. 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 СНЕЖНЯ 2013 г. СУБОТА № 231 (27596) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# ПА ПРАЦЫ І ЎЗНАГАРОДЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь 2012 года заслужаным людзям краіны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Асаблівую ўрачыстасць гэтаму мерапрыемству надало тое, што яно ўпершыню прайшло ў Палацы Незалежнасці ў спецыяльна створанай Зале дзяржаўных узнагарод. «Тым самым мы яшчэ раз падкрэсліваем глыбокую павагу дзяржавы да сваіх грамадзян, працоўнымі здзяйсненнямі і творчымі перамогамі якіх ганарыцца ўся краіна», — адзначыў беларускі лідар.

Гаворачы аб лаўрэатах дзяржпрэміі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што выбар аказаўся вельмі няпростым. На адкрытым конкурсе былі прадстаўлены работы многіх адораных даследчыкаў, дзеячаў навукі і культуры. «Перамаглі тыя, чые дасягненні з'яўляліся вынікам шматгадовай дзейнасці моцных і аўтарытэтных школ, традыцыі якіх, закладзеныя ў савецкія часы, былі прымножаны ў гады незалежнасці», — сказаў Прэзідэнт.

Лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі на гэты раз сталі 3 калектывы. Сярод іх прадстаўнікі айчыннай школы хімічнага сінтэзу БДУ Міхаіл Арцем'еў, Анатоль Лесніковіч і Алег Івашкевіч. Гэтыя вучоныя стварылі больш за 100 неарганічных злучэнняў на аснове мікра- і нанаразмерных часціц, якія атрымалі шырокае прымяненне ў самых розных сферах — ад вытворчасці ракетнага паліва да барацьбы з патагеннымі мікраарганізмамі.

Высокае прызнанне заслужылі Леанід Танін, Пётр Майсеенка і Мікалай Макарэвіч, якія распрацавалі галаграфічныя сродкі аховы дакументаў і каштоўных папер. «Гэты перспектыўны напрамак актыўна развіваецца ў нашай краіне. За апошнія гады ўжо выпушчана больш за 30 млрд галаграм. А на сусветнай выстаўцы «Галаграфія-2012» у Астане трэць экспанатаў была з Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Лаўрэатам Дзяржпрэміі ў галіне навукі і тэхнікі стаў таксама аўтарскі калектыў Мінскага завода колавых цягачоў у складзе Андрэя Галавача, Юрыя Нікалаева і Яўгена Гарко. Яны спраектавалі і ўкаранілі ў серыйную вытворчасць цягачы і шасі 4-га пакалення. «Прадукцыя, створаная па іх распрацоўках, складае аснову ракетных войскаў і войскаў ППА Беларусі і Расіі, экспартуецца ў 30 дзяржаў свету», — падкрэсліў беларускі лідар.

У Зале дзяржаўных узнагарод ушаноўвалі лаўрэатаў Дзяржпрэміі ў галіне мастацтва і архітэктуры. Прэмія, якой удастоены Віктар Манаеў, Вольга Мацкевіч і Андрэй Зубрыч, стала прызнаннем творчых заслуг стваральнікаў спектакля «Пінская шляхта» тэатра імя Янкі Купалы.

Вядучай салістцы Вялікага тэатра оперы і балета Ніне Шарубінай прэмія ўручана за развіццё опернага мастацтва ў Беларусі.

Дзяржпрэміі таксама ўдастоены стваральнікі комплексу «Мінск-Арэна» Валерый Куцко, Уладзімір Будаеў і Анатоль Шабалін. «Яны прадэманстравалі сапраўды наватарскі падыход да ўзвядзення спартыўных аб'ектаў сусветнага ўзроўню. Сёння на базе «Мінск-Арэны» фарміруецца важны грамадскі і культурна-спартыўны цэнтр нашага горада. А архітэктурныя адметнасці і рысы горада будучага знаходзяць свой працяг у новабудоўлях сталіцы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб комплексе «Мінск-Арэна», Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзякуючы будаўніцтву гэтага аб'екта ў Беларусі з'явілася магчымасць прыняць чэмпіянат па хакеі з шайбай. «Не было б яго, не было б і чэмпіянату свету», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Работнікам розных сфер дзейнасці ўручаны дзяржаўныя ўзнагароды Беларусі. Сярод іх рабочыя Мінскага маторнага завода, якія ўдастоены ордэнаў Пашаны за важкі ўклад у развіццё вытворчасці і павышэнне якасці прадукцыі.

На ўрачыстай цырымоніі прысутнічалі і прадстаўнікі аграпрамысловага комплексу з розных абласцей Беларусі, якія ўдастоены высокіх званняў і ўзнагарод за плённую работу ў сельскагаспадарчай галіне і дасягненні высокіх вытворчых паказчыкаў.

Прадстаўнікам сілавых структур, якія стаяць на варце парадку і якія асабліва вызначыліся, уручаны ордэны «За службу Радзіме» III ступені.

Асобныя словы падзякі кіраўнік дзяржавы адрасаваў прадстаўнікам творчай інтэлігенцыі, удастоеным ганаровых званняў і ордэнаў. «Выдатныя артысты Беларускай дзяржаўнай філармоніі, мастакі ўзбагачаюць беларускую культуру, радуюць нас сваім талентам і майстэрствам, выхоўваюць дастойную адораную змену», — адзначыў Прэзідэнт.

Акрамя таго, званняў «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» і «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» удастоены тыя, хто ўносіць значны ўклад у развіццё фізкультуры і спорту.

Усім узнагароджаным Аляксандр Лукашэнка пажадаў, каб атрыманыя імі ўзнагароды сталі яшчэ адной вяхой на шляху да новых здзяйсненняў.

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ



Інспекцыя правярае выпраўленыя ярлыкі на прадукцыі.




**Днямі расійскія паліцэйскія «накрылі» ў Падмаскоўі падпольную фабрыку па вырабе фальшывага і небяспечнага адзення, паведамляе МУС Расіі. Па яго інфармацыі, на фабрыцы выявілі больш за 70 тон гатовага адзення (у тым ліку дзіцячага) пад лэйбамі вядомых замежных вытворцаў. Прадукцыю рэалізоўвалі праз пункты аптова-рознічнага гандлю ў Маскве. Спадзяюся, што падобныя вырабы не дайшлі да нашага рынку. Для таго, каб яны і надалей не з'яўляліся ў беларускіх гандлёвых цэнтрах, Дзяржстандарт сочыць за выкананнем сумеснай з Мінгандлем, Мінсельгасхарчам і Міндароўя пастановы, якая вызначае спрошчаныя спосабы пацвярджэння якасці і бяспекі тавараў для індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку. Учора адбыўся паўторны маніторынг аднаго са сталічных гандлёвых цэнтраў.**



Копіі сертыфікатаў.

## УСЕ РЭКВІЗІТЫ НА МЕСЦЫ

...Хоць і прайшло паўгадзіны пасля адкрыцця, яшчэ не ўсе крамы працуюць. Прадстаўнікоў Дзяржстандарта і Мінгарвыканкама непакоіць, што тыя, каго яны павінны сёння паўторна праверыць, пазачынялі на «тэхнічныя перапынкі» свае павільёны і не вяртаюцца нават праз дзесяць хвілін, пазначаныя на паперцы-аб'яве. «Гэта парушэнне працоўнага рэжыму», — канстатуюць спецыялісты. Але вось адна з крамак адчыняецца, і мы ўсе накіроўваемся туды.

«Па выніках першага маніторынгу мы выдалі рэкамендацыі тым, у каго былі парушэнні. Зараз мы паглядзім, як яны выправілі гэтыя парушэнні, — кажа па дарозе **намесніца начальніка аддзела Інспекцыі дзяржнагляду за выкананнем патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў і стандартаў Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і горадзе Мінску Людміла КУЗНЯЦОВА.**

СТАР. 2

*ЦЫТАТА ДНЯ*




**Генеральны дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы» Анатоль АКАНЦІНАЎ:**

***«Тыдзень беларускай кухні і піва пройдзе ў Мінску падчас ЧС-2014 па хакеі. Падзейны турызм — гэта сусветны трэнд, і наша краіна не павінна адставаць у гэтым плане. Беларусь у 2014 годзе трэба паказаць не толькі з пункту гледжання хакея. Гэта ўнікальны шанц, калі да нас прыедуць заўзятары, і трэба максімальна выкарыстоўваць гэтую магчымасць. Мерапрыемствы праекта «7 цудаў свету ў Беларусі», якія пройдуць да, падчас і пасля ЧС-2014, дапамогуць разнастаіць праграму для турыстаў. Сярод іх шакаладны баль у Дзень святога Валянціна і фестываль жаночай прыгажосці да 8 Сакавіка. Акрамя гэтага, мы прапануем правесці механічнае шоу з удзелам беларускай аўтатрактарнай тэхнікі, якая можа паказваць віртуозныя трукі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9400,00 | ▲ |
| Еўра | 12840,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 285,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1144,25 | ▲ |

# Вызначалі лепшых прадпрымальнікаў

**У Беларусі вызначаны пераможцы і лаўрэаты рэспубліканскага конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2012 года». Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта, указ № 549 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 5 снежня.**

Конкурс праводзіўся ў два этапы ў 16 намінацыях (на рэгіянальным, а потым на рэспубліканскім узроўнях).

Лепшым прадпрымальнікам у сферы вытворчасці прадуктаў харчавання стала сумеснае беларуска-польскае прадпрыемства «КАМАКА ПЛЮС» у форме таварыства з абмежаванай адказнасцю, у сферы вытворчасці прамысловых тавараў — таварыства з абмежаванай адказнасцю «М8 Сіці».

Лепшым прадпрымальнікам у сферы інфармацыйных тэхналогій прызнана сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Гейм Стрым», у сферы будаўнічай дзейнасці — закрытае акцыянернае таварыства «Спецаргбуд», у сферы рознічнага гандлю — замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Арыфлэйм Касметыкс».

У намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у сферы грамадскага харчавання» перамагло гандлёва-вытворчае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Пухавічыгандаль».

Лепшы прадпрымальнік у сферы медыцынскай і фармацэўтычнай дзейнасці — закрытае акцыянернае таварыства «БелАсептыка», у сферы турызму і гасцінічнага абслугоўвання — прыватнае навукова-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму».

Таварыства з дадатковай адказнасцю «МАНТРАНС» названа лепшым у сферы аказання транспартных паслуг, замежнае прыватнае гандлёва-сэрвіснае ўнітарнае прадпрыемства «Мультымотарс» — у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва, сялянская (фермерская) гаспадарка «Цнянскія экапрадукты» прызнана лепшай сялянскай (фермерскай) гаспадаркай.

Лепшым суб'ектам інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва стала камунальнае інфармацыйнае ўнітарнае прадпрыемства «Гомельскі абласны інфармацыйна-метадычны цэнтр», лепшым прадпрымальнікам у сферы інавацыйнай дзейнасці — таварыства з абмежаванай адказнасцю «МЕМПЭКС».

Сярод арганізацый з замежнымі інвестыцыямі пераможцам вызначана сумеснае закрытае акцыянернае таварыства «Навукова-вытворчы комплекс «Эка-Лес-О», лепшым прадпрымальнікам-экспарцёрам — сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЛЛК-НАФТАН».

Лепшым прадпрымальнікам — арганізатарам новых рабочых месцаў стала замежнае прыватнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «АЛКАПАК».

У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы ўзнагароджанне ад яго імя пераможцаў і лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу ва ўрачыстай абстаноўцы будзе праводзіць прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч.

Як адзначылі ў прэс-службе, конкурс праводзіцца ў мэтах папулярызацыі прадпрымальніцтва, павышэння дзелавой актыўнасці і прафесіяналізму суб'ектаў прадпрымальніцтва.

■ Што ў «жыроўцы»?

# ТАРЫФЫ НА ТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ І КАПРАМОНТ УСТАНОВІЦЬ АБЛВЫКАНКАМ

**Прэзідэнт Беларусі 5 снежня падпісаў указ № 550 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання тарыфаў (цэн) на жыллёва-камунальныя паслугі і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».**

Як паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы, дакументам прадугледжваюцца захады па ўдасканаленні тарыфнага рэгулявання жыллёва-камунальных паслуг і парадку аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі насельніцтву (ДАСД), а таксама па папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства.

## Адказнасць мясцовых выканкамаў за стан ЖКГ будзе павышана

Правы мясцовых органаў улады ў пытаннях цэнаўтварэння пашырацца. У прыватнасці, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму будуць перададзены паўнамоцтвы ад Савета Міністраў па рэгуляванні тарыфаў на асобныя віды жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву.

СТАР. 2

■ На скрыжаванні думак

# СТАРШАЯ ШКОЛА — НЕ ДЛЯ ЎСІХ?

## ...парламентарыі і педагогі выказваюцца за ўвядзенне абмежаванняў на прыём вучняў у 10-ы клас

**Увесці экзамен для ахвотных навучацца ў 10—11-х класах, узаконіць у старшай школе профільнае навучанне, лібералізаваць працэс атэстацыі педагагічных работнікаў, увесці кампенсацыі за праезд да месца працы сельскім педагогам, дыферэнцыяваць нагрузку на настаўнікаў-прадметнікаў, адмовіцца ад безадзнакавага навучання ў пачатковай школе — вось далёка не поўны пералік прапаноў, якія гучалі падчас парламенцкіх слуханняў, прысвечаных удасканаленню заканадаўчай базы нацыянальнай сістэмы адукацыі. Сваім бачаннем таго, як прывесці заканадаўства ў адпаведнасць з патрэбамі часу, дзяліліся як дэпутаты, так і звычайныя педагогі, кіраўнікі мясцовых органаў улады, дырэктары ўстаноў адукацыі, прадстаўнікі галіновага прафсаюза педагагічных работнікаў. Дыскусія атрымалася вельмі вострай, і далёка не па ўсіх пытаннях у выступоўцаў супадалі думкі. Узяць хоць бы далейшы лёс малакамплектных школ...**

## ВЁСКІ БЕЗ БУДУЧЫНІ?

Пазіцыя галоўнага адукацыйнага ведамства, якую агучыў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, заключаецца ў тым, што сетка дзейных устаноў адукацыі з'яўляецца — з эканамічнага пункту погляду — неэфектыўнай, а таму сітуацыю трэба змяняць. Але непасрэдна на месцах людзі разважаюць зусім не эканамічнымі катэгорыямі.

— У Бялыніцкім раёне за апошнія 10 гадоў колькасць вучняў паменшылася ўдвая, і, як вынік, закрыліся 7 школ, што складае трэцюю частку. Калі тэндэнцыя захаваецца, то ў раёне застануцца ўсяго дзве сельскія школы, — паведаміла **дырэктар сярэдняй школы №1 г.п. Бялынічы Таццяна БАЛДЫШЭЎСКАЯ.** — Абвастрае праблему і дазвол адкрываць у сельскіх школах 10-11-я класы толькі пры ўмове наяўнасці ў іх не менш за пяць вучняў. Скарачаюцца класы, скарачаюцца працоўныя месцы, настаўнікам даводзіцца вырашаць, як ім дабірацца да новага месца працы. Таму і маладыя спецыялісты не замацоўваюцца на вёсцы. Больш за палову з іх звальняюцца, бо не бачаць для сябе перспектыў. Бацькі не могуць зразумець, чаму пры наяўнасці ў вёсцы школы дзяцей возяць у суседнюю.

СТАР. 5

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## АБАМА НАЗВАЎ ДВУХ МАГЧЫМЫХ ПЕРАЕМНІКАЎ

Прэзідэнт ЗША Барак Абама мяркуе, што ў віцэ-прэзідэнта Джозэфа Байдэна, як і ў былога дзяржсакратара Хілары Клінтан, ёсць шанцы перамагчы на будучых ў 2016 годзе прэзідэнцкіх выбарах. «Абое яны — і Хілары, і Джо — могуць стаць выдатнымі лідарамі, яны валодаюць усімі неабходнымі для гэтага якасцямі», — заявіў Абама ў эфіры тэлеканала NBC, адзначыўшы, што не можа аддаць перавагу ніводнаму з дваіх магчымых прэтэндэнтаў на галоўную дзяржаўную пасаду. Віцэ-прэзідэнт ЗША прызнаўся, што выношвае прэзідэнцкія амбіцыі.

## САВЕТ БЯСПЕКІ ААН ДАЗВОЛІЎ ФРАНЦУЗСКУЮ ІНТЭРВЕНЦЫЮ

Савет Бяспекі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прыняў рэзалюцыю, якая санкцыянуе ўвод французскіх войскаў і сіл Афрыканскага саюза ў Цэнтральнаафрыканскую Рэспубліку. У ЦАР пачаліся сутыкненні паміж баевікамі самаабвешчанага прэзідэнта рэспублікі Мішэля Джатадыі і праціўнікамі яго рэжыму. Толькі ў ходзе нядаўняга канфлікту, які пачаўся ў ноч на чацвер, загінулі прынамсі 100 чалавек. Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка — фактычна хрысціянская краіна: каля 50 % насельніцтва вызнаюць хрысціянства. Аднак Джатадыя — мусульманін і абапіраецца на мусульманскую ўзброеную групоўку.

## ДЗІЦЯ ШУКАЙЦЕ У КАПУСЦЕ. БРУСЕЛЬСКАЙ

Пра гэта гаворыць дыетолаг Німа Савідс. У прыватнасці, сакрэт капусты складаецца ў наяўнасці ў ёй фоліевай кіслаты. А яна важная для павышэння паказчыкаў фертыльнасці у мужчын і жанчын і зніжае рызыку выкідышаў і прыроджаных дэфектаў, піша The Daily Mail. Таксама брусельская капуста багатая на вітаміны, што павышае шанцы на выжыванне будучага дзіцяці. Яшчэ ў капусце змяшчаецца фітазлучэнне, якое дапамагае целу жанчыны пазбавіцца ад лішкаў эстрагену, што павышае фертыльнасць. Да таго ж, агародніна зніжае паказчыкі халестэрыну і валодае супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ПАМЁР НЭЛЬСАН МАНДЭЛА

**У Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы ўвечары 5 снежня на 96-м годзе жыцця памёр легендарны змагар з апартэідам, першы чарнаскуры прэзідэнт краіны, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Нэльсан Мандэла.**

У тэлевізійным звароце да суграмадзян прэзідэнт ПАР Джэйкаб Зума паведаміў, што Мандэла будзе пахаваны з дзяржаўнымі ўшанаваннямі. Па распараджэнні прэзідэнта, у гэты дзень на ўсёй тэрыторыі Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі будуць прыспушчаны сцягі.




***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Джэйкабу Зуму, родным і блізкім Нэльсана Мандэлы, а таксама ўсяму народу, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы. «З глыбокім болем і смуткам у Рэспубліцы Беларусь успрынялі паведамленне аб смерці былога Прэзідэнта Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, легендарнага змагара за свабоду, роўнасць і правы чалавека Нэльсана Мандэлы, — гаворыцца ў спачуванні. — Яго адданасць ідэалам справядлівасці і чалавекалюбства, унікальная мудрасць дзяржаўнага дзеяча будуць заўсёды з'яўляцца прыкладам для палітыкаў усяго свету».***

■ Азбука бяспекі

# ЦЫКЛОН ЛЕПШ ПЕРАЧАКАЦЬ ДОМА

**У сувязі з рэзкім пагаршэннем умоў надвор'я, выкліканым узмацненнем халоднага антыцыклону, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях рэкамендуе грамадзянам быць гранічна ўважлівымі да сябе і іншых.**

Па магчымасці падчас непагадзі лепш знаходзіцца ў будынках, у памяшканнях, якія ацяпляюцца, не выходзіць на вуліцу, адмовіцца ад прагулак. Неабходна памятаць, што, знаходзячыся на вуліцы, не варта хадзіць блізка ад праезнай часткі і побач з лёгкімі канструкцыямі — моцным парывам ветру вас можа або саміх знесці ўбок, або адкінуць на вас незамацаваныя прадметы.

Далёкія паездкі лепш увогуле адмяніць. Дзяцей, пажылых, людзей з нестабільным здароўем без крайняй неабходнасці таксама з дому не трэба выводзіць, забяспечыўшы за імі кантроль.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях заклікае аўтааматараў устрымацца ад паездак на сваім транспарце. Калі ёсць патрэба, лепш скарыстацца грамадскім. Калі ж паездкі нельга пазбегнуць, праверце перад ёй стан аўтамабіля, узроўні ўсіх вадкасцяў, у тым ліку запоўніце шклоамывальнік вадкасцю, якая не замярзае, каб забяспечыць добры агляд. Вазьміце ў дарогу запас паліва, ежу і цёплыя рэчы. У дарозе ў выпадку, калі будзе набліжацца транспарт аператыўнага прызначэння, трэба забяспечыць яму бесперашкодны праезд.

Калі заўважылі надзвычайную сітуацыю — паведамляйце ў МНС па тэлефоне 101. Калі апынуліся на месцы надзвычайнага здарэння ці нештатнай сітуацыі — дакладна выконвайце ўказанні і рэкамендацыі работнікаў ДАІ і МНС. Трэба памятаць, што аварыйныя службы валодаюць усёй патрэбнай інфармацыяй і прымаюць рашэнні, зыходзячы з гэтага.

**Сяргей РАСОЛЬКА**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# БОЛЬШ ДАСТУПНАГА ЖЫЛЛЯ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч лічыць неабходным удасканаліць структуру жыллёвага будаўніцтва ў краіне. Аб гэтым ён заявіў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаліся праблемныя пытанні развіцця будаўнічага комплексу Беларусі, а таксама шляхі яго развіцця, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Трэба больш будаваць жылля даступных спажывецкіх якасцяў, — адзначыў прэм'ер-міністр. — У людзей павінен быць выбар зыходзячы з фінансавых магчымасцяў».

Аб стане спраў у галіне кіраўніку ўрада далажыў віцэ-прэм'ер Анатоль Калінін. У цэлым у 2013 годзе назіраецца адносна станоўчая дынаміка работы будаўнічага комплексу: прагназуецца выкананне паказчыкаў тэмпу росту аб'ёму прамысловай прадукцыі на ўзроўні 108 працэнтаў, рэнтабельнасці продажаў таксама на ўзроўні 108 працэнтаў, дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі павінна скласці $310 млн, дадатнае сальда гандлю паслугамі — $70 млн. Тэмп росту экспарту тавараў у будаўнічым комплексе за дзевяць месяцаў гэтага года склаў 110 працэнтаў да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года, тэмп росту экспарту паслуг — 205 працэнтаў.

Разам з тым якасныя паказчыкі плацежаздольнасці прадпрыемстваў сведчаць аб наяўнасці праблем у галіне. Так, на 1 кастрычніка гэтага года дэбіторская запазычанасць па арганізацыях Мінбудархітэктуры склала Br6,4 трлн, крэдыторская — Br26,9 трлн. У тым ліку запазычанасць па крэдытах і пазыках — Br19 трлн.

З улікам існуючай сітуацыі, паводле слоў Анатоля Калініна, урад мае намер выбудаваць жорсткую адназначную канструкцыю інвестыцыйнага працэсу, канкрэтна вызначыўшы ролі, правы і абавязкі ўсіх яго ўдзельнікаў. «Гэтыя падыходы прапісаны ў распрацаваным праекце ўказа «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці будаўнічай галіны і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», а таксама пакеце нарматыўна-прававых актаў», — сказаў ён. Толькі ў снежні гэтага года для падпісання іх прапануецца больш як 15.

Што ж датычыцца непасрэдна праекта ўказа, то, як растлумачыў Анатоль Калінін, у ім дакладна вызначаны функцыі і адказнасць дзяржаўных заказчыкаў, устанаўліваецца матэрыяльная і адміністрацыйная адказнасць усіх удзельнікаў будаўнічай дзейнасці за парушэнні пры праектаванні, будаўніцтве аб'ектаў, а таксама за невыкананне ўзятых на сябе дагаворных абавязацельстваў. «Асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца перадінвестыцыйнай стадыі будаўнічага працэсу», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра.

■ Парламенцкае супрацоўніцтва

# ФРАНЦУЗСКІЯ «ДЗВЕРЫ» Ў МЫТНЫ САЮЗ

**«Беларусь можа стаць тымі «дзвярыма», праз якія заходнія кампаніі атрымаюць доступ на перспектыўны рынак Мытнага саюза», — заявіў на брыфінгу па выніках візіту ў нашу краіну французскай парламенцкай дэлегацыі Цьеры Марыяні, намеснік старшыні групы дружбы «Францыя — Беларусь».**

«Асноўная мэта нашага прыезду ў Беларусь — развіццё супрацоўніцтва ў розных галінах і паляпшэнне яго якасці, — падкрэсліў французскі парламентарый. — Мы сустракаліся з міністрам эканомікі Рэспублікі Беларусь Мікалаем Снапковым, і ён паведаміў, што сёння ў краіне працуе толькі 40 кампаній з французскім капіталам. Натуральна, мы лічым, што гэтага вельмі мала як для Беларусі, так і для Францыі». Цьеры Марыяні ўпэўнены, што нашы краіны маюць вялікі патэнцыял у развіцці адносін амаль ва ўсіх галінах і галоўнае, што трэба зараз зрабіць, — гэта напрацаваць неабходныя кантакты ў розных сферах.

У студзені наступнага года плануецца адкрыццё сумеснага франка-беларускага бізнес-клуба па прыкладзе таго, які ўжо створаны паміж Беларуссю і Германіяй. «Для пашырэння беларуска-французскага гандлёвага супрацоўніцтва трэба растлумачыць французскім кампаніям, што ваша краіна сапраўды сёння дае цудоўныя магчымасці для развіцця ўзаемавыгадных стасункаў, — адзначыў намеснік старшыні групы дружбы «Францыя — Беларусь». — Нашы кампаніі недастаткова знаёмыя з патэнцыялам, у тым ліку тэхнічным, які маюць беларускія прадпрыемствы, не ведаюць яны і пра спрыяльны клімат у вашай краіне для развіцця бізнесу».

Па словах Цьеры Марыяні, нягледзячы на тое, што некаторыя пытанні палітычнага характару не даюць магчымасці здзяйсняць у поўнай меры канструктыўны дыялог, парламентарыі больш, чым афіцыйныя дыпламаты, вольныя ў сваіх дзеяннях. У прыватнасці, гэты візіт дазволіць значна пашырыць двухбаковыя стасункі.

Сёння супрацоўніцтва паміж краінамі здзяйсняецца, у першую чаргу, у сферах адукацыі, навукі, культуры: створаны Франка-Беларускі цэнтр еўрапейскіх даследаванняў, Французская медыятэка. Тавараабарот за перыяд са студзеня па верасень гэтага года склаў больш за 430 мільёнаў долараў. На рэгіянальным узроўні адносіны падтрымліваюцца дзякуючы пабрацімскім сувязям паміж гарадамі абедзвюх краін: беларускім Брэстам і Брэстам у Францыі, Наваполацкам і Шафаем, Мінскам і Ліёнам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# Тарыфы на тэхабслугоўванне і капрамонт установіць аблвыканкам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, яны будуць рэгуляваць тарыфы на паслугі па тэхнічным абслугоўванні, капітальным рамонце, карыстанні жылымі памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду (акрамя жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання), водазабеспячэнні, каналізацыі (водаадвядзенні), карыстанні ліфтамі (тарыфы на вываз і абясшкоджванне адходаў ужо рэгулююцца імі).

За Саветам Міністраў захоўваецца рэгуляванне тарыфаў на паслугі па газа-, электра- і цеплазабеспячэнні, платы за карыстанне жылымі памяшканнямі ў інтэрнатах дзяржаўных устаноў адукацыі.

Гэтыя захады зроблены для таго, каб павысіць адказнасць мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў за стан жыллёва-камунальнай галіны на рэгіянальным узроўні, а таксама збалансаваць аб'ёмы плацяжоў насельніцтва, бюджэтнага і перакрыжаванага субсідавання як крыніц кампенсацыі затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг.

Каб выключыць істотны рост і значныя адрозненні ў памеры тарыфаў па абласцях, іх рэгуляванне будзе ажыццяўляцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам па ўзгадненні з Міністэрствам эканомікі.

❑ ❑ ❑

Указам вызначаецца, што ў мэтах павышэння акупнасці жыллёва-камунальных паслуг і з улікам росту даходаў насельніцтва **павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва, якія субсідуюцца дзяржавай, будзе ажыццяўляцца штогод з 1 студзеня ў памеры, эквівалентным 5 доларам (па сярэднегадавым значэнні абменнага курсу беларускага рубля да долара ЗША), у разліку на сям'ю з трох чалавек, якая жыве ў двухпакаёвай кватэры агульнай плошчай 48 кв.м, пры нарматыўным спажыванні жыллёва-камунальных паслуг.**

Таксама прадугледжана індэксацыя тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва. Яна будзе ажыццяўляцца штоквартальна на працягу фінансавага года ў памерах, якія не перавышаюць фактычнага індэкса намінальнай заработнай платы за папярэдні квартал. Індэксацыя цэн і тарыфаў на газ, электрычную і цеплавую энергію будзе ажыццяўляцца ўрадам. На паслугі па тэхнічным абслугоўванні, водазабеспячэнні, водаадвядзенні (каналізацыі), карыстанні ліфтам — аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам па ўзгадненні з Мінэканомікі. На паслугі па вывазе, абясшкоджванні і перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў — аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Кантроль за тым, каб тарыфы змяняліся ў памеры не вышэй за вызначаныя гранічныя абмежаванні (5 долараў плюс індэксацыя), будзе ажыццяўляць Мінэканомікі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Павелічэнне тарыфаў (цэн) на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва, якія субсідуюцца дзяржавай, вышэй за рост плацяжоў будзе ажыццяўляцца па ўзгадненні з Прэзідэнтам Беларусі.

**Тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі будуць штогод павялічвацца ў памеры, не большым за ўстаноўленыя гранічныя абмежаванні (5 долараў плюс індэксацыя).**

## Сацпадтрымка — толькі тым, хто мае патрэбу ў дапамозе

У рамках сістэмы дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД) прадастаўляюцца пяць сацыяльных выплат, у тым ліку — штомесячная сацыяльная дапамога і забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця для малазабяспечаных сем'яў (грамадзян).

Для забеспячэння адраснасці сацпадтрымкі ўказ устанавіў дакладныя «фільтры», каб штомесячную сацыяльную дапамогу і забеспячэнне прадуктамі харчавання атрымлівалі толькі тыя сем'і (грамадзяне), якія маюць патрэбу ў такой дапамозе па аб'ектыўных прычынах.

Так, уводзяцца абмежаванні па прадастаўленні штомесячнай сацыяльнай дапамогі працаздольным членам сям'і (грамадзянам), якія на працягу 12 месяцаў, што папярэднічаюць месяцу звароту, з'яўляліся занятымі альбо зарэгістраванымі ў якасці беспрацоўных менш за 6 месяцаў; а таксама тым, хто, з'яўляючыся беспрацоўным, на працягу 6 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу звароту, адмовіліся ад прапанаванай прыдатнай працы або ад праходжання прафпадрыхтоўкі ці павышэння кваліфікацыі па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Адначасова пашыраецца пералік падстаў для адмовы ў прадастаўленні такіх сацыяльных выплат сем'ям, якія паўторна звяртаюцца па дапамогу, калі працаздольны член сям'і не выканаў вызначаны камісіяй план па самастойным паляпшэнні матэрыяльнага становішча (калі толькі на тое не было аб'ектыўных прычын).

❑ ❑ ❑

Удасканалены парадак прадастаўлення дзяржаўнай адраснай сацдапамогі. У прыватнасці, сацыяльная дапамога для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў будзе выдавацца не два, а чатыры разы на працягу каляндарнага года (пры захаванні агульнага памеру дапамогі).

Штомесячную і аднаразовую сацыяльную дапамогу і сацыяльную дапамогу на падгузкі цяпер можна будзе атрымаць таксама і на даму — праз арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па дастаўцы пенсій і дапамог. Гэтым новаўвядзеннем змогуць скарыстацца адзінокія інваліды I, II групы і грамадзяне, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту, бацькі ў няпоўных сем'ях, якія з'яўляюцца інвалідамі I, II групы або якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў.

**Святлана БУСЬКО.**

# ТАМОГРАФ СУПРАЦЬ ХВАРОБ

**У Брэсцкай гарадской бальніцы №1 урачыста адкрылі пасля рэканструкцыі тры аддзяленні. Адно з іх — тамаграфічнае. У ім устаноўлены новы камп'ютарны тамограф. Для абласнога цэнтра гэта сапраўды значная падзея.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Раней тамографы былі толькі ў абласной бальніцы і анкалагічным дыспансеры. Хворыя запісваліся на абследаванне за некалькі месяцаў. Цяпер гэты від сучаснай медыцынскай дапамогі стане больш даступным. Паводле слоў **загадчыка аддзялення Аляксандра КУПРЫНЮКА,** на новым апараце, аналагаў якому няма ў вобласці, можна абследаваць галаўны мозг, грудную клетку, унутраныя органы. Тамограф коштам 11 мільярдаў рублёў таксама дасць магчымасць выяўляць на ранняй стадыі анкалагічныя захворванні, вызначаць колькасць кальцыю ў касцях, што паскорыць лячэнне і хутчэйшае выздараўленне пацыентаў. На новым апараце можна рабіць прыцэльную біяпсію, што таксама паўплывае на якасць дыягностыкі.

Павіншаваць медыкаў і пацыентаў з завяршэннем чарговага этапу рэканструкцыі 115-гадовай бальніцы прыехаў старшыня аблвыканкама Канстанцін СУМАР. Губернатар адзначыў, што рэканструкцыя старэйшай бальніцы горада будзе завершана ў 2015 годзе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

НАВІНЫ

## СТАЛІЦА БЕЗ МАЛАКА НЕ ЗАСТАНЕЦЦА

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён Шапіра пракаментаваў сітуацыю з абмежаваннем асартыменту малака, якая склалася ў сталічнай гандлёвай сетцы.**

Як адзначыў губернатар, Міншчына пастаўляе для сталіцы 80% прадукцыі, іншыя рэгіёны краіны — 20%. З павышэннем цэн кіраўнікі прадпрыемстваў палічылі, што ім больш выгадна ў аб'ёмы заяўленых паставак малака ўключаць і іншыя прадукты перапрацоўкі. Напрыклад, пудынгі, тварожныя вырабы. Гэта і паўплывала на недахоп сацыяльна значнага прадукту ў крамах.

«У сувязі з гэтым мы прынялі рашэнне, што ў выпадку зніжэння паставак малака пад поўную патрэбу прадпрыемствамі з іншых рэгіёнаў, Міншчына зможа забяспечыць ім горад цалкам. Гэта не складана, паколькі ў цэнтральным рэгіёне надойваюць штодзень 3 тыс. 200 тон малака, а сталіца спажывае — 270—280 тон», — запэўніў Сямён Шапіра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ШКОЛЬНІКІ З ГОМЕЛЯ ПРАВАЛІЛІСЯ ПАД ЛЁД

**Гомельскі гарадскі аддзел Следчага камітэта праводзіць праверку па факце гібелі двух васьмігадовых хлопчыкаў у заліве ракі Сож у горадзе Гомель. Пра гэта паведаміла афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення Следчага камітэта Марыя Крываногава.**

Зіма толькі пачалася. Вадаёмы паціху зацягваюцца лядовай скарынкай. Апошняя пакуль вельмі тонкая і не ў стане вытрымаць нават дзіцячую вагу. Гэта яшчэ раз пацвярджае няшчасце, якое здарылася з гомельскімі школьнікамі.

— Тры вучні 2 класа СШ № 72 пасля ўрокаў, перш чым пайсці дадому, завіталі на вадаём, які знаходзіцца каля школы, — распавядае Марыя Крываногава. — Вада была часткова пакрыта лёдам. Пад цяжарам вагі школьнікаў тонкі лёд праламаўся. На дапамогу дзецям кінуліся двое выпадковых сведак здарэння, якім удалося выратаваць аднаго з іх. Хлопчыка з дыягназам «пераахаладжэнне» даставілі ў Гомельскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу. Яго сяброў, на жаль, выратаваць не ўдалося.

Падчас праверкі абставін надзвычайнага здарэння прызначаны судова-медыцынскія экспертызы, апытваюцца сведкі, у тым ліку адміністрацыя школы і настаўнікі. Следчы камітэт у чарговы раз заклікае бацькоў расказваць сваім дзецям аб небяспецы, якую ўяўляюць сабой вадаёмы.

**Надзея ПАЎЛАВА.**

ПАДЗЕІ

## ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ СКАРАЦІЛІСЯ

**Па выніках лістапада золатавалютныя рэзервы нашай краіны па метадалогіі МВФ скараціліся на 355,5 млн долараў ЗША і, па папярэдніх звестках, на 1 снежня склалі 6,4652 млрд долараў ЗША ў эквіваленце, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

У нацыянальным вызначэнні рэзервы скараціліся на 444,5 млн долараў і на 1 снежня склалі 7,0488 млрд. «Скарачэнне золатавалютных запасаў абумоўлена зніжэннем цаны на золата на міжнародным рынку каштоўных металаў, а таксама пагашэннем Нацыянальным банкам і ўрадам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце, якія ў лістападзе былі выкананы ў поўным аб'ёме», — тлумачаць у Нацбанку. Дарэчы, падтрыманню аб'ёму золатавалютных рэзерваў спрыяла размяшчэнне валютных аблігацый Міністэрства фінансаў на ўнутраным рынку краіны.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## МІНСКАЕ «ДЫНАМА» АТРЫМАЛА Ў СЕЗОНЕ ПЕРШУЮ ГАСЦЯВУЮ ПЕРАМОГУ!

**Прыемная навіна прыйшла з Хабараўска, дзе мінчане перайгралі мясцовы «Амур» (3:2).**

Здавалася, усё ў гэтым матчы ў руках беларусаў. Збынек Іргл і Рыхард Лінтнер зрабілі галявы зачын такім, што балельшчыкі за дзесяць хвілін да завяршэння сустрэчы ўжо пачалі верыць у выніковую вікторыю. Аднак хабараўчане напрыканцы паядынку здолелі перавесці матч у авертайм. Пераможцу выяўляць давялося ўжо па булітах — хакейных пенальці, у якіх фартуна ўсміхнулася менавітам «зубрам». 3:2 — гэта першая гасцявая перамога «Дынама» ў сёлетнім розыгрышы Кантынентальнай хакейнай лігі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

ФАКТЫ

## КАМЕТА ISON НА НОВЫ ГОД ПАДОРЫЦЬ МЕТЭОРНЫ ДОЖДЖ

**Гэтае касмічнае цела, якое не вытрымала гравітацыі і экстрэмальна высокай тэмпературы пры зблiжэнні з Сонцам, можа паднесці незвычайны падарунак землянам да Новага года. Воблака пылу і абломкаў, што ўтварылася пасля разбурэння ядра каметы, па словах шэрагу навукоўцаў, перасячэцца з траекторыяй руху Зямлі вакол Сонца ў навагоднюю ноч, а таксама ў перыяд з 2 па 4 студзеня. У выніку на Зямлі можна будзе назіраць за актыўнымі метэорнымі патокамі, перадаюць сусветныя інфармагенцтвы.**

Больш дакладную інфармацыю аб магчымым узмацненні метэорнай актыўнасці, звязанай з каметай ISON, навукоўцы дадуць крыху пазней, пасля аналізу руху дробных частак нябеснага цела. Прынцыпова важнымі для такіх назіранняў стануць два дні — 16 і 24 снежня, калі пылавое воблака будзе перасякаць арбіты такіх планет, як Меркурый, Венера і Зямля.

Што тычыцца патэнцыйнай небяспекі для Зямлі, якую могуць уяўляць абломкі каметы Айсон, то, па словах дырэктара абсерваторыі «Ка-дар» Станіслава Кароткага, турбавацца няма пра што, бо яны будуць рухацца на велізарнай адлегласці ад нашай планеты. Спецыяліст падкрэсліў, што ў любым выпадку 2-4 студзеня можна будзе назіраць моцную метэорную актыўнасць, прычым ніякім чынам не звязаную з каметай. Гаворка ідзе пра метэорны паток Квадрантыды, пра які навукоўцам Зямлі вядома ўжо шмат гадоў.

**Сяргей КУРКАЧ**

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Больш за ўсё памылак было ў маркіроўцы прадукцыі, а гэта ўжо парушэнне закона аб абароне правоў спажыўцоў. Адсутнічала поўная інфармацыя аб тавары, яго саставе, паходжанні, датах вырабу, гарантыйным тэрміне. Яны далі справаздачу, што ўсё выправілі, і набылі дэкларацыю ці падаюць інфармацыю, што тавар не сертыфікаваны».

У павільёне гандлююць жаночай бялізнай. Гэта тавар, за якім асабліва сочаць, бо бялізна непасрэдна датыкаецца да цела чалавека. «Памылкі ў маркіроўцы ўсе выпраўлены. Сёння ў прадаўца ёсць сертыфікаты Мытнага саюза на ўвесь асартымент. На этыкетцы прысутнічае найменне вырабу, артыкул, памер, колер, цана, вытворца і імпарцёр — усе рэквізіты на месцы, — падсумоўваюць спецыялісты. — Усё даведзена да адпаведнасці. Сертыфікаты атрыманы ад Расіі. Прадавец гэтай прадукцыі ў Расіі сертыфікаваў яе і прадаставіў копіі дакументаў гэтаму гандлёваму пункту». Калі мы пакідаем краму, спецыялісты дадаюць, што многія буйныя замежныя кампаніі праводзяць сертыфікацыю ў Расіі і даюць дакументы прадаўцам на ўсёй тэрыторыі Мытнага саюза.

Аднак не ўсе вытворцы і пастаўшчыкі так робяць. Прадавачка жаночага абутку, сумак і пальчатак скардзілася, што ім давядзецца рабіць усё самім: «Ніхто нам не дапамагае ў сертыфікацыі. Закупляецца ўсё праз Маскву, натуральна. Столькі гадоў працуем у адным рэжыме, а цяпер трэба перастройвацца».

### РАЗГУБІЛІСЯ

Прадавачкі ў наступнай краме сустрэлі нас вельмі здзіўленымі позіркамі. Калі ўсе прадставіліся і папрасілі паказаць, як выпраўлены памылкі, дзяўчаты зусім разгубіліся. Адзінае, што яны змаглі сказаць: «Мы ўвогуле замяняем прадаўца. Таму нічога не ведаем». Але праверку ўсё роўна правялі. Вопратка, якая прадаецца ў краме, зноў мела этыкеткі з парушэннямі. «Мы выдалі рэкамендацыю па прывядзенні да адпаведнасці маркіровачных ярлыкоў. Але краіна-вытворца і юрыдычны адрас прадаўца не ўказаны, памер, цана і састаў — ёсць. Дарэчы, з замежнымі вытворцамі праблему часта вырашаюць так: калі тавар мае маркіровачную стужку, дзе пазначаны сімвалы па доглядзе і састаў сыравіны, гэтыя паказчыкі не ўносяцца ў таварны ярлык. Дакументаў аб пацвярджэнні якасці і бяспекі таксама не было. А цяпер жа тыя, хто не мае сертыфікатаў пацвярджэння, павінны даваць спецыяльны дакумент пакупніку, у якім прапісваецца, што ў выпадку, калі тавар будзе неналежнай якасці, яго забяруць назад і аддадуць грошы.

Дарэчы, Людміла Кузняцова ўдакладніла, на што ў першую чаргу трэба глядзець пакупніку: з чаго, калі і дзе выраблены, дзе закуплены тавар. «Бо калі закупка ідзе ў краіне-вытворцы, гэта адна гісторыя. І зусім іншая, калі гэта перакупка ў іншым месцы. Пакупнік мае права на поўную інфармацыю. Калі не пазначана, дзе выраблена, ужо павінны быць сумненні. Цяпер ёсць такія штучныя матэрыялы, якія вельмі цяжка адрозніць ад натуральных звычайнаму чалавеку».

**ДАРЭЧЫ**

**Маніторынг праведзены на 218 рынках у 1900 індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку ў 1412 — першы маніторынг, а ў 488 — паўторны. Падчас першага маніторынгу выяўлены парушэнні ў 1286 індывідуальных прадпрымальнікаў пры рэалізацыі шырокага спектра вырабаў лёгкай прамысловасці.**

### ЗРАБІЛІ ТОЛЬКІ ПАД ПРЫМУСАМ

Пакуль мы чакалі адкрыцця іншых крам, падышоў прадпрымальнік, у якога ўжо правяралі тавар у мінулы раз. Ён сказаў, што ўсё выправіў, але не захацеў, каб інспекцыя праверыла зноў, спасылаючыся на прысутнасць журналіста.

Мужчына задаў некалькі пытанняў па сертыфікацыі прадстаўнікам дзяржстандарту і вельмі здзіўляўся таму, што многія пазачыняліся на «тэхнічныя перапынкі», калі ўбачылі інспекцыю. На пытанне, чаму раней ніхто не хацеў правяраць свой тавар на якасць, ён адказаў: «Калі не абавязваюць, то навошта гэта рабіць? А цяпер прыходзіцца».

Тут жа падышла яшчэ адна прадпрымальніца і паскардзілася на тое, што ў яе маленькія партыі і яна не можа кожны раз плаціць за сертыфікацыю. Ёй растлумачылі, што пратаколы аб выпрабаваннях дзейнічаюць 3-5 гадоў, а на кожную новую партыю з таго ж самага матэрыялу дэкларацыя запаўняецца на падставе папярэдніх пратаколаў. Каштуе гэта значна танней.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ЧАМУ Ў КВАТЭРЫ ЗМОЎКЛА РАДЫЁ?

**Нашай падпісчыцы з Заслаўя Лідзіі Андрэеўне Казак, якая пражывае ў мікрараёне-1 у доме №18, пайшоў ужо 91 год. Нягледзячы на такі паважаны ўзрост, жанчына вельмі цікавіцца навінамі, якія потым пераказвае сваім дзецям. Паколькі тэлевізар доўга глядзець ужо не можа, Лідзія Андрэеўна чэрпае іх са «Звязды», але найперш — з радыёперадач. Ды вось бяда: ужо каля месяца радыё маўчыць.**

— У нашым пяціпавярховым доме шмат пажылых людзей, якія, як і я, днямі слухаюць радыё. Дакладней, слухалі. Куды мы толькі ні спрабавалі звяртацца, каб дазнацца прычыну яго маўчання, усё безвынікова. Можа, вы дапаможаце разабрацца, у чым справа? — папрасіла нас Лідзія Андрэеўна.

Вядома ж, рэдакцыя не магла адмовіць такому адданаму нашаму чытачу. Але як ні намагаліся, прычыну адключэння радыё так і не высветлілі, як і не даведаліся, калі яно зноў запрацуе. Недзе цягам тыдня дзясяткі разоў набіралі і гарадскі, і мабільны нумар тэлефона начальніка лінейна-тэхнічнага ўчастка № 3 Мінскага раённага цэха электрасувязі Аляксея Анкудовіча, ды той так ні разу не падняў трубку. Хаця ў рынгтоне мабільнага Аляксея Вячаслававіча кожны раз гучала песня, дзе былі і такія словы: «нас злучыў беларускі «Тэлекам». Чамусьці не злучыў...

Мела рацыю паважаная Лідзія Андрэеўна, калі казала, што нікуды немагчыма дазваніцца. «Абяцаюць некага пазваць да тэлефона — і не завуць», — гаварыла нашага заяўніца падчас звароту ў рэдакцыю. Журналісту газеты таксама чамусьці адмаўляліся даваць нумар тэлефона, каб іншы спецыяліст мог бы патлумачыць прычыну маўчання радыё. «Усё — толькі праз начальніка». А начальнік не адказвае...

У Заслаўскім гарвыканкаме давялося толькі пачуць, што з 1 студзеня наступнага года праваднога радыё не будзе. «Лініі зношаныя, сувязістам іх цяжка падтрымліваць».

...Пасля безвыніковых спроб атрымаць інфармацыю патэлефанавалі Лідзіі Андрэеўне. А раптам радыё ўжо падключылі? Мы ж называлі і сутнасць скаргі чытачкі, і яе адрас. Трубку зняла дачка жанчыны. Адказала, што радыё як маўчала, так і маўчыць. Нядаўна яны прыйшлі да высновы, што трэба, мабыць, набыць для маці прыёмнік, які працуе ад сеткі...

**Намеснік начальніка Мінскага раённага цэха электрасувязі па лінейных збудаваннях Андрэй ЖАРКЕВІЧ,** нягледзячы на занятасць, выслухаўшы наш зварот, паабяцаў аператыўна разабрацца ў сітуацыі, якую мы не змаглі высветліць праз Заслаўе. А перад тым коратка расказаў, што гаворка ідзе не пра адключэнне праваднога радыёвяшчання, а пра яго аптымізацыю. Больш падрабязную інфармацыю пра гэта можна знайсці на сайце «Белтэлекама». Сапраўды, там, дзе яно знікне, людзям давядзецца карыстацца прыёмнікамі.

— У тым жа Заслаўі ёсць у продажы айчынныя коштам па 150 тысяч рублёў: з гадзіннікам, будзільнікам. Яны прымаюць увесь FM-дыяпазон, — сказаў Андрэй Рамуальдавіч.

Што тычыцца вяшчання праваднога радыё, суразмоўца адназначна заўважыў, што з 1 студзеня ў Заслаўі яно не знікне. Пра канкрэтную прычыну яго маўчання ў кватэры нашай падпісчыцы паабяцаў паведаміць крыху пазней.

Недзе праз паўгадзіны Андрэй Жаркевіч сам набраў рэдакцыйны нумар.

— На даху дома пашкоджаны фідар. Зрабіць нешта сёння немагчыма, паколькі ў такіх умовах надвор'я работы на вышыні забароненыя (размова была ў пятніцу, калі чакаўся моцны цыклон. — **С.Р.**). Але ў бліжэйшы час усё выправім, — паабяцаў суразмоўца. — Пытанне ўзятае на кантроль.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
на I квартал
або 1-е паўгоддзе 2014 года —
запаўняйце картку ўдзельніка,
выразайце і дасылайце яе
ДА 11 СТУДЗЕНЯ
ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.







Сярод падпісчыкаў 14.01.2014 г. будуць разыграны 7 мультыварак Scarlet і суперпрыз – тэлевізар Samsung. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да 24.01.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.03.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**

**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 14.11.13 г.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 15.11.13 ПА 31.03.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2255 ад 30.10.13, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку______________________

______________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________на I кв. або 1-е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон [        ] ______________
(індэкс)

______________________________

______________________________

Удачы ў розыгрышы!

■ Афіцыйна

# «Ад вінта»




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Пад такім загалоўкам у нумары «Звязды» ад 3 кастрычніка быў змешчаны фотарэпартаж Анатоля Клешчука пра арганізаваны Беларускай федэрацыяй звышлёгкай авіяцыі Рэспубліканскі авіясалон, падчас якога браты па крылах не толькі паднімалі ў паветра свае апараты — парапланы, мотадэльтапланы, лёгкія самалёты, але і абмяркоўвалі (у дыялогах і спрэчках) магчымасць спрашчэння правілаў на дазвол палётаў. А таксама — шматгадовае ігнараванне дэльтапланерысцкага руху, забароны здзяйсняць самастойныя палёты, завышаныя (ледзь не да ўзроўню пілотаў пасажырскіх «боінгаў») патрабаванні медкамісіі. Прынамсі, каб прайсці яе, пілоту авіяцыі даводзіцца ехаць у сталіцу (часам з самых аддаленых куткоў Беларусі), траціць некалькі дзён. А раней жа, нават у строгія і не менш адказныя савецкія часы, медкамісію праходзілі па месцы жыхарства — яна прыраўноўвалася да той, што праходзяць кіроўцы…**

**Авіятараў-аматараў хвалявала таксама і залішняя бюракратыя ў рэгістрацыі сканструяваных уласнымі рукамі паветраных апаратаў, якая прыводзіць да таго, што самадзейная авіяцыйна-тэхнічная творчасць пачала сыходзіць у падполле…**

Як паведаміў **дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Уладзімір КОСЦІН,** рэгістрацыя паветранага судна ў Дзяржаўным рэестры грамадзянскіх паветраных суднаў Беларусі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Авіяцыйнымі правіламі рэгістрацыі грамадзянскіх паветраных суднаў, зацверджанымі пастановай Міністэрства транспарту і камунікацый ад 12 лютага 2008 года і распрацаванымі ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб Міжнароднай грамадзянскай авіяцыі, прынятай у Чыкага 7 снежня 1947 года, паветраным кодэксам Беларусі і законамі на падставе дакументаў фізічных і юрыдычных асоб. Цяганіны альбо бюракратыі з афармленнем рэгістрацыйнага пасведчання на паветранае судна ніколі не ўзнікала. Інспектаванне паветраных суднаў аматарскай канструкцыі з мэтай вызначэння прыдатнасці да палётаў (і выдачы адпаведнага сертыфіката) ажыццяўляецца адпаведнай пастаянна дзейнай камісіяй, а распрацоўшчыкам аматарскіх канструкцый належыць выконваць патрабаванні Авіяцыйных правілаў. Што датычыць выкарыстання паветранай прасторы Беларусі, гэтую функцыю ўзяло на сябе Міністэрства абароны. Прапанова ўвесці ў краіне апавяшчальны парадак выкарыстання паветранай прасторы пакуль не знаходзіць падтрымкі ў органаў, якія валодаюць гэтай кампетэнцыяй.

Што датычыць праходжання медкамісіі, то, як паведаміў першы намеснік міністра аховы здароўя Д. Л. Піневіч, медыцынскі агляд авіяперсаналу праводзіць адзіная ў Беларусі ўрачэбна-лётная экспертная камісія, якая знаходзіцца ў Мінску. Але частку абследаванняў можна прайсці і па месцы жыхарства. Звычайна тэрмін праходжання камісіі складае да 2-х дзён. Але ў асобных выпадках магчымы і больш доўгі тэрмін — гэта залежыць ад стану здароўя пілота. Насамрэч патрабаванні да стану здароўя пілотаў-планерыстаў з'яўляюцца менш строгімі, чым да пілотаў іншых паветраных суднаў. Даслоўна: «Аб'ём медыцынскіх абследаванняў для авіяперсаналу грамадзянскай авіяцыі Беларусі: пілотаў, пілотаў-планерыстаў, членаў экіпажаў паветраных суднаў і патрабаванні, якія прад'яўляюцца да стану іх здароўя, грунтуюцца на прынцыпах бяспекі палётаў і адпавядаюць міжнародным крытэрыям па медыцынскай сертыфікацыі авіяцыйнага персаналу» ■

■ Дзённік настаўніка

# АБ ВЕДАХ, ВЫСОКІХ БАЛАХ І ЗАЛАТЫХ МЕДАЛІСТАХ



Кожны з настаўнікаў шчыра жадае, каб усе вучні не проста любілі яго прадмет, але і добра гэты прадмет ведалі. У ідэале, дык нават «на выдатна»…

І што ж тады атрымліваецца?

Атрымліваецца, што ідэальны вучань-выдатнік павінен ведаць усе школьныя прадметы амаль на ўзроўні настаўнікаў?

І гэта пры тым, што кожнаму з настаўнікаў дастаткова ведаць «на выдатна» толькі свой уласны прадмет!

Хіба ж гэта справядліва?

Сапраўды, навошта будучаму філолагу сядзець цэлымі вечарамі над падручнікам фізікі, упарта спрабуючы разабрацца ў мудрагелістых формулах гэтага няпростага прадмета? Дзеля таго толькі, каб атрымліваць на ўроках фізікі «дзявяткі» ды «дзясяткі»? Навошта будучаму перакладчыку ў дасканаласці ведаць механізмы сінтэзу бялку альбо, скажам, утварэння донарна-акцэптарнай хімічнай сувязі? Але ж прыходзіцца, калі гэты вучань (вучаніца) з'яўляецца выдатнікам (выдатніцай) і марыць закончыць школу з залатым медалём…

Мне могуць запярэчыць, што дзеці ёсць дзеці, і з узростам прыцягальнасць тых ці іншых будучых спецыяльнасцяў можа ў іх свядомасці кардынальным чынам змяняцца. І калі сёння хлопчык марыць, напрыклад, аб ваенным вучылішчы, то ўжо заўтра прафесія ўрача можа стаць для яго куды больш прыцягальнай. Так і з прадметамі: учора вучань лічыў галоўнымі для сябе фізіку і матэматыку, а тут раптам біялогія выходзіць на першы план…

Усё так, але ж у дзясятым (і, тым больш, у адзінаццатым) класе пераважная большасць вучняў ужо дакладна вызначылася з будучай прафесіяй. І шчыра жадае паглыбленага вывучэння менавіта тых школьных прадметаў, якія і спатрэбяцца потым у першую чаргу…

А прыходзіцца паглыблена вучыць усё, калі хочаш атрымаць, акрамя патрэбных табе ведаў, яшчэ і высокі бал атэстата…

Але ж і настаўніка-прадметніка можна зразумець.

Ёсць падручнік, ёсць праграма… а ў праграме, між іншым, канкрэтна распісана, за які ўзровень ведаў па гэтым прадмеце выводзіцца той ці іншы бал…

І як настаўнік можа ставіць вучню «дзявятку» (тым больш, «дзясятку»), калі той у сваіх адказах альбо пісьмовых праверачных работах нават да васьмёркі не дацягвае? Што падумаюць пра гэта іншыя вучні — тыя, веды якіх настаўнік ацэньвае куды больш прынцыпова? І ці задаволіць іх адказ, што, павысіў, маўляў, бал вучню толькі таму, што «ідзе» ён на залаты медаль?

А раптам пазапланавая праверка з раёна альбо нават з вобласці? Дадуць кантрольны зрэз… і вучань, у якога адны «дзявяткі» ў журнале, той зрэз толькі на слабую «шасцёрачку» адолее. А то і таго менш…

І што, таксама будзеш кантралёрам тлумачыць пра неабходнасць завышэння адзнак таму ці іншаму вучню толькі па прычыне яго імкнення да залатога медаля?

Калі шчыра, то ўсялякае бывае. І завышаюць па просьбе калег-педагогаў. Бо як не паставіць крыху завышаную адзнаку вучню, які толькі што раённую алімпіяду бліскуча выйграў і зараз на абласную збіраецца (а там, глядзіш, і да рэспубліканскай дойдзе!). Няхай сабе і не па тваім прадмеце… але ж гонар школы і ўсё такое…

Ды і выпускнікі самі выкручваюцца, як могуць…

Памятаю адзін выпускны клас, які бліскуча выходзіў з такой няпростай сітуацыі. У іх гэта атрымлівалася, таму што, па-першае, клас той быў вельмі дружны і вучні ў ім не толькі не зайздросцілі поспехам адно аднаго, але і шчыра ім радаваліся. Па-другое ж…

Амаль кожны вучань у гэтым класе ведаў адзін альбо два школьныя прадметы на больш высокім узроўні, чым аднакласнікі. На алімпіядах па гэтых прадметах паспяхова выступаў, менавіта з гэтымі прадметамі будучыню сваю звязаць марыў. З гісторыяй, філалогіяй, фізікай… Адзін хлопчык нават астраноміяй усур'ёз захапіўся…

І таму існавала ў іх своеасаблівая ўзаемадапамога. На кожным з урокаў той з вучняў, які менавіта гэты прадмет лепш за іншых засвоіў, увесь клас выручаў. І ведаў, што на астатніх уроках і яму самому сябры абавязкова дапамогуць…

Вось так клас той і скончыў школу. Паспяхова і з вельмі высокімі баламі. І амаль усе выпускнікі паступілі потым менавіта туды, куды і жадалі. Прычым з першага ж заходу…

Але ж гэта не выйсце! Не таму нават, што не ўсе выпускныя класы такія дружныя і рознабаковыя па ведах.

Проста гэта не выйсце…

**Генадзь АЎЛАСЕНКА** ■

■ На чужых памылках

## «Звезда» — зусім не «Звязда»…

**Не буду ўтойваць: падпіска на перыядычныя выданні (нават на месяц) — задавальненне не таннае. Асабліва калі выпісваеш і раённую газету, і абласную, і рэспубліканскую, і штотыднёвік «ЛіМ», і нешта з драбязы…**

Словам, схадзіла жонка на пошту, заплаціла патрэбную суму і вярнулася дамоў заклапочанай. Маўляў, дарагавата заплаціла: мабыць, зноўку цэны змяніліся…

Пачаўся месяц. Усе выданні, на якія падпісаліся, паштальён прыносіць, а вось «Звязды» — няма. Сталі разбірацца, чаму, вывучаць квітанцыі…

Аказалася, што жанчына, якая падмяняла нашу загадчыцу пошты (тая была ў адпачынку), замест газеты «Звязда» выпісала нам… аднайменны літаратурна-мастацкі часопіс «Звезда»!

Потым мы атрымалі яго, пагарталі, пачыталі, але ж замяніць любімую газету ён ні ў якім разе не мог.

Таму ўсім чытачам нашай роднай газеты на роднай мове хацелі б паведаміць, што «Звезда» — зусім не «Звязда»: не паўтарыце нашу памылку.

**Аляксандр МАТОШКА,**
*в. Янкавічы, Расонскі раён.*

■ Свой погляд

## ГРОШЫ НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

**Вось і адышла восень… Ураджай сабраны. Нешта, дзякаваць Богу, вырасла ў тых, хто папрацаваў, каму паспрыяла здароўе. Цяпер як быццам час адпачынку. Але ж усё роўна не сядзіцца — мы шукаем і знаходзім сабе занятак. Нехта дапаможа дзецям у выхаванні ўнукаў, нехта нешта пашые ці звяжа, кошык спляце, нехта цікавае штосьці ўзгадае…**

Час ад часу я перагортваю старонкі свайго жыцця і заўсёды параўноўваю яго з сучасным. Чыстую праўду скажу: нялёгка жыць цяпер і маладым, і старым. Але калі было лёгка?

Прыпамінаю дзяцінства, жыццё бацькоў, вайну, пасляваеннае ліхалецце, калі радаваліся скарынцы хлеба і бульбіне… Ратавала тады адно: мы верылі ў будучыню, стараліся працаваць, вучыць дзяцей. Сёння ім таксама нялёгка, але ж жыццё на тое і жыццё, каб паспрабаваць усяго. Хіба ж цікава жыць, калі ўсім забяспечаны? Думаю, што не, што свята кожны дзень таксама надакучыла б! Аднак маладым сёння хочацца менавіта яго! І — каб адразу ж.

Гляджу на сучасную моладзь, на сваіх унукаў: прыгожа апранутыя, заўсёды пад'еўшы, у кожнай сям'і камп'ютар ці не ў кожнай — аўтамабіль. Мы такое жыццё хіба ў кінафільмах бачылі. Шчыравалі ў працы, але ж нічога не мелі; жылі ў адной краіне, атрымлівалі амаль аднолькавую зарплату. А пачалася перабудова — і (цуд які!) раптам з'явіліся багатыя. Адкуль?

Ну сапраўды — многа сумятні нарабілі грошы. Яшчэ больш наробяць, бо прага да іх ахапіла ледзь не ўсё насельніцтва. Грошы не могуць правіць светам, не павінны быць на першым месцы, бо яны здольны знішчаць у чалавеку самыя прыгожыя якасці… А па мне, дарэчы, дык лепш небагата, але па-людску. Я за ўсё пакаленне нават скажу: мы пражылі жыццё без аўтамабіляў, катэджаў, раскошы… Але ў іншы свет мы пойдзем з чыстым сумленнем.

Моладзь цяпер не думае пра гэта, не звяртае ўвагі на здароўе. Чалавечы век становіцца ўсё карацейшым. А жыццё — гэта ж вялікая радасць, нават калі жывеш не ў палацах.

**Лідзія ЛУК'ЯНАВА,**
*в. Швабы, Лагойскі раён*

■ Тым часам

# Аляксей Грос узяў самаадвод ад удзелу ў «Еўрабачанні-2014»



**Колькасць фіналістаў нацыянальнага адбору паменшылася на аднаго — цяпер іх засталося 14. 5 снежня кіраўніцтва прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» звярнулася ў Белтэлерадыёкампанію з просьбай адклікаць заяўку Аляксея Гроса.**

Улічваючы негатыўную тэндэнцыю апошніх гадоў (практычна на кожным беларускім адборы на «Еўрабачанне» ўспыхвалі скандалы большай ці меншай інтэнсіўнасці), гэта «зняцце з дыстанцыі» выклікала абвостраную ўвагу сярод артыстаў і пэўныя чуткі: ці не піяр-ход на чыюсьці карысць? Але куфар адкрыўся адразу і без сакрэтаў: як высветлілася, прадстаўленая артыстам на конкурс песня бельгійскага кампазітара Марка Паэлінка «If I could do it all again», правы на якую прадзюсарскі цэнтр атрымаў летась, ужо гучала публічна ў выкананні іншага спевака, а гэта парушае правілы беларускага адбору. У п. 7 арт. 2 палажэння аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура дакладна вызначана гэта патрабаванне і тэрмін яго дзеяння: «У праекце можа ўдзельнічаць песня (музыка і (ці) тэкст, якая не была камерцыйна рэалізавана: распаўсюджана праз інтэрнэт, а таксама на якіх-небудзь носьбітах (аўдыякасеты, кампакт-дыскі, міні-дыскі і інш.) праз продаж ці іншым спосабам, перададзена ў радыё- ці тэлевізійны эфір, а таксама выканана публічна да 1 верасня 2013 года».

У прадзюсарскім цэнтры, салістам якога з'яўляецца Аляксей Грос, заўважаюць, што для ўсёй каманды факт, які выявіўся, стаў непрыемнай нечаканасцю: усё ж ранейшае супрацоўніцтва з Маркам Паэлінкам мела плён. Менавіта з яго песняй салістка «Спамаша» Алена Ланская прайшла ў фінал міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013», дзе заняла 16-е месца… «Чаму так атрымалася — будзем разбірацца з аўтарам, — каментуе сітуацыю артыст. — Я мог бы звярнуцца з просьбай змяніць кампазіцыю, тым больш у запасе яшчэ ёсць дзве вельмі моцныя песні. Але, паважаючы правілы і арганізатараў адбору, я не хачу, каб гэтая прыкрая падзея стала нагодай для размоў і чутак, таму і адклікаю сваю заяўку. Але ва ўсім трэба бачыць добры бок: з'явіўся яшчэ адзін год на падрыхтоўку, і да наступнага адбору я буду яшчэ ў лепшай форме. Афіцыйна заяўляю: я настроены толькі на перамогу!».

Кіраўніцтва Белтэлерадыёкампаніі, якая на правах адзінага ў Беларусі члена Еўрапейскага вяшчальнага саюза традыцыйна выступае арганізатарам нацыянальнага адбору і рыхтуе абранага ўдзельніка да конкурсу, задаволіла гэты зварот. Замяняць Аляксея Гроса іншым артыстам не сталі: дзеля гэтага давялося б наноў ладзіць праслухоўванне сярод сямі дзясяткаў выканаўцаў. «Змяншэнне колькасці фіналістаў не парушае правілы адбору, дзе пазначана, што журы можа адабраць да 15 выканаўцаў», — дадала кіраўнік прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі Святлана Смалонская-Краскоўская.

Такім чынам, у фінальным канцэрце, які адбудзецца ў студзені 2014 года, гледачы і журы будуць абіраць дэлегата ад Беларусі з 14 прэтэндэнтаў (Мацвей Бандарэнка, Юрый Вашчук, Дарыя, Жанет, Макс Лорэнс & ДзіДзюЛя, Анастасія Малашэўская, Арцём Міхаленка, Аліна Мошчанка, гурт «Napoli», гурт «Nuteki», Наталля Адзінцова, Алена Сіняўская, Наталля Тамела, гурт «Switter boys»). Пераможцам адбору і ўдзельнікам «Еўрабачання-2014» у Даніі стане той з іх, каму ўдасца набраць найбольшую колькасць балаў па суме галасавання публікі і прафесійнага журы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

■ Слова мужчыны

## ТАЯ, ЯКАЯ МАЛОДЗІЦЬ

**Толькі хранічна хворы не бачыць жаночай прыгажосці.**
**А якая яна, гэта прыгажосць, і якая жанчына, што падабаецца нам, мужчынам? Пытанні, па-мойму, вечныя. Як вечнае жыццё наша.**

Усё пайшло ад Адама і Евы. Няхай так, няхай будзе, як у Бібліі. Мусіць, так прасцей чалавеку — не мучыцца пытаннем, што ён грэшны. Усе мы грэшныя на гэтай зямлі. У кожнага свой грэх, свой крыж, які трэба пранесці годна.

Але ўявім сабе, што на зямлі не засталося жанчын. І…

Я не пра тое, што не было б дзяцей (хіба з прабірак), я пра іншае — пра тое, што яны, жанчыны, робяць з намі. Ад чаго да іх такое прыцягненне?

Бог стварыў нас, каб мы жылі побач, разам.

Жанчына нас малодзіць. Вядома ж, не кожная і не заўсёды. І справа тут не толькі ў сексе. І нават не ў тых дзявочых ножках, якія растуць ад вушэй. Не люблю, дарэчы, мадэляў, не гляджу шоу з удзелам гонкіх і празрыстых. Магчыма, я старамодны і ў жанчынах нечага не разумею. Але аб густах не спрачаюцца. Прачытаў у кнізе, якой амаль сорак гадоў: «Падзявочы маладыя грудзі вырываліся з празрыстай кофтачкі, з наіўнага палону вузенькага ліфчыка» — і адразу адчуў, што я мужчына. Гераіня прываблівае, бо яна ўмее паказаць сваё, жаночае, ад чаго ў мужчыны пачынае шалёна біцца сэрца. Што гэта сваё — няхай скажа яна сама, бо павінна ж ведаць, чым прывабіць мужчыну.

Без жанчын нам, мужчынам, ну ніяк! У той жа кнізе чытаю: «Яна праводзіла яго да дзвярэй, хутаючыся ў халат, які нічога не ўмеў у ёй схаваць». У тыя гады, калі выходзіла кніга, пурытаніну савецкіх часоў фраза магла падацца непрыстойнай. Рэдактары маглі сказаць пісьменніку: «Ну навошта такі халат? Няхай бы купіла іншы, каб закрываў тыя ж калені. І не празрысты, а баваўняны…».

Сёння для жанчын столькі аксесуараў, што той халацік з 1980-х можна смела здаваць у музей. Аднак мужчын-імпатэнтаў становіцца больш. Чаму? Цяжка сказаць… Можа, экалогія, а можа, час такі, калі бяжым і не можам спыніцца. Да таго ж, як мне здаецца, знікла ў жанчын тая загадкавасць, тая цікавінка, якая заўсёды прывабслівала да сябе…

Густы мяняюцца. А жанчына застаецца. Цяпер — пад уплывам часу і СМІ — яна куды смялейшая і вальнейшая… Але не менш патрэбная: патрэбная, як паветра! Дзіка, згадзіцеся, глядзець, як цалуюцца-мілуюцца двое маладых хлопцаў або звіваюцца ў экстазе дзве дзяўчыны. Гэта не наша — чужое. Хочацца думаць, што да рэгістрацыі шлюбу двух маладых хлапцоў, як гэта робіцца ў Францыі, у нас не дойдзе.

У нас застанецца па-ранейшаму — Ён і Яна… Як адно цэлае. Мужчына адчувае сябе маладым побач з той жанчынай, якая яго малодзіць. Для некага яна тая, што «коня на скаку остановит…», для некага — іншая, больш далікатная і пяшчотная… Галоўнае, каб той, хто вядзе яе, ведаў, што яна — палавінка. І жыцця без яе няма.

**Мікалай МАРОЗ,**
*г. Шуміліна.*

■ Рэзананс

## «Не перайсці мяжу, за якой падзенне»

**Як чытача газеты мяне зацікавіў ліст спадара М. Мароза з г. Шуміліна «Ці там мы шукаем ісціну?» (№ 211).**

Згодны з аўтарам: раней людзі і сапраўды былі больш адкрытыя, шчырыя, дружныя. Магчыма, таму, што пасля гэткай кровапралітнай вайны шукалі нейкай спагады, дабрыні. А яшчэ ўсюды — і ў вёсках, і ў гарадах — было адчуванне, што людзі ведаюць адзін аднаго…

Зразумела, і тады выпівалі — гарэлку, нейкія напоі, але ж гэта не так кідалася ў вочы. У людзей таго часу быў нейкі духоўны камертон, які прымушаў чалавека ў любых абставінах трымаць сябе ў руках, не пераходзіць мяжу, за якой — падзенне…

Так, людзей пітушчых цяпер шмат, нават вельмі шмат, але ж яны — таксама людзі, жывыя… І крыж на іх ставіць рана…

Мне здаецца, што нам трэба сур'ёзна паварочвацца да нашай культуры, зацікаўліваць людзей сапраўднымі ідэямі, гісторыяй краю, усім, што завецца Айчынай. Тады і выпіўка неяк адыдзе на другі план. А калі сёння многія людзі (асабліва маладыя) не ведаюць, хто такія Багдановіч, Купала, Колас, не кажучы ўжо пра Гарэцкага ці Танка, то якая ж тут духоўнасць?

…Я сваю шклянку гарэлкі п'ю адзін раз на год — у Дзень Перамогі. Напэўна, таму, памінаючы ўсіх палеглых у мінулай вайне, адчуваю, якая пякучая гэта гарэлка!

Вайна і алкагалізм — застарэлыя хваробы людзей. І барацьба з імі толькі адна — сапраўдны ўздым духоўнасці і чалавечай культуры.

**Уладзімір ГОЛУБЕЎ,**
*г. Мінск.*

# ПАСЛЯ «ЕЎРАБАЧАННЯ» — НА НОВАЙ ХВАЛІ…

**Ілья Волкаў зможа выступіць на «Новай хвалі — 2014». Таксама яму прапанавалі ўдзел у міжнародным конкурсе ў Малдове, які пройдзе вясной, і запіс кліпа на студыі А. Даўжэнкі ў Кіеве. Пра гэта бронзавы прызёр дзіцячага «Еўрабачання 2013» паведаміў на прэс-канферэнцыі журналістам.**

— Здзейснілася мая мара, — прызнаўся юны артыст. Для мяне было вельмі пачэсна прадстаўляць нашу краіну, і лічу, што трэцяе месца на міжнародным конкурсе такога ўзроўню — добры вынік. Я зрабіў усё добра і магу ганарыцца сабой.

Падзяліўся ён і сваімі эмоцыямі ад конкурсу: «Хваляванне ў большай ступені ў мяне прысутнічала на генеральнай рэпетыцыі, калі журы сакрэтна выстаўляла балы. Таму што дарослае журы заўсёды больш патрабавальнае. А ў самым фінале ў мяне было менш эмоцый. На той момант першы конкурсны дзень быў ужо пражыты, і на другі я быў упэўнены, што з усім спраўлюся. Не было нейкіх думак пра тое, што і як атрымаецца». Пра нумары іншых удзельнікаў, якія разам з ім выходзілі на конкурсную сцэну, Ілья судзіць не бярэцца, бо, па яго меркаваннях, станоўчыя і адмоўныя моманты ёсць у кожнага.

Пасля конкурсу жыццё юнага артыста мала змянілася. Ён ходзіць у школу і настройваецца на новыя конкурсы. Так, напрыклад, калі паедзе ў Малдову, трэба будзе прадставіць дзве кампазіцыі на англійскай мове: аўтарскую і сусветны хіт. У перспектыве Ілья хацеў бы перайсці на выкананне джазу і року. А можа, нават яшчэ раз паехаць на конкурс «Еўрабачання».

Разважалі ўдзельнікі беларускай дэлегацыі і на тэму паспяховасці беларускіх дзяцей, якія ўжо не першы год прадстаўляюць краіну на «Еўрабачанні».

— Кожны год мы бачым на адборы розных дзяцей. Аднак, калі ў дзіцяці прысутнічае непасрэднасць, а музычны матэрыял супадае з ім, тады атрымліваецца добры вынік, — адзначыла кіраўнік дэлегацыі на міжнародным конкурсе, выканаўчы прадзюсар тэлеканала «Беларусь 2» Людміла Барадзіна. — Задача не ў тым, каб заняць нейкае месца, галоўнае — перамагчы сябе, сваё хваляванне і зацікавіць сваёй песняй публіку. Бо калі дзіця на сцэне думае пра перамогу, то часам наогул забывае пра тое, што спявае і дзеля чаго выйшла туды.

Проста ўмець спяваць і танцаваць недастаткова — трэба быць падрыхтаваным да конкурсу маральна і фізічна. «У нас былі рэпетыцыі кожны дзень. Прычым у дні непасрэдна перад конкурсам рабілі ўхіл не на нумар, а на фізічную падрыхтоўку. Практыкаванні на вынослівасць, на развіццё сілы мышцаў. Калі казаць пра эмацыянальны стан падчас конкурсу ў Кіеве, то ўсё атрымалася, бо ў дзяцей ужо быў вопыт выступлення на сцэне», — падкрэсліла кіраўнік танцавальнай студыі «Maksi Brizz» Ганна Саковіч.

Сёлета на конкурсе дзейнічала новаўвядзенне: арганізатары ўзнагароджвалі за першыя тры прызавыя месцы. Практыкаваць гэты падыход на нацыянальным адборы не плануецца. Ацэньваць прэтэндэнтаў па-ранейшаму будзе прафесійнае журы.

— Часам прыхільнікі аднаго выканаўцы могуць змяніць сітуацыю пры галасаванні: яны выбіраюць свайго. А мы імкнёмся пaглядзець на ўсіх і выбраць лепшага. Для гэтага і існуе прафесійнае журы, — рэзюмавала Людміла Барадзіна.

У развагах пра тэндэнцыі конкурсу сышліся на меркаванні, што ўдзельнікам не варта спрабаваць арыентавацца на «леташнія тэндэнцыі»: напрыклад, калі другі год перамагае балада, то выбіраць менавіта такі жанр. У такім падыходзе мала станоўчага. Тым самым змяншаецца спектр музычнага матэрыялу, а на конкурсе хацелася б бачыць розныя жанры і падыходы, працаваць сярод моцных удзельнікаў.

**Алена ДРАПКО.**

■ Кватэрнае пытанне

# Перабудова — з праектам і без…

**Мы стаім у чарзе на атрыманне службовага жылля. Даюць яго, як правіла, не ў новых дамах. Значыць, прыйдзецца рабіць рамонт, магчыма — з частковай перабудовай… На якія віды работ цяпер патрэбны праект і дазвол выканкама?**

**А. Касцюк,**
*г. Мінск*

Згодна з тыпавым дагаворам найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2013 г. № 193), наймальнік мае права самастойна за кошт уласных сродкаў або з прыцягненнем жыллёва-эксплуатацыйнай ці іншай арганізацыі, якая ажыццяўляе эксплуатацыю жылога дома, выконваць рамонт кватэры, замену і рамонт зношанага ўнутрыкватэрнага санітарна-тэхнічнага, газавага, электрычнага і іншага абсталявання.

Што датычыцца перабудовы жылога памяшкання, то гэтае пытанне рэгламентавана палажэннем, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 2013 г. № 384.

Прынамсі, **узгадненне (дазвол) мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, а таксама распрацоўка праектнай дакументацыі патрабуюцца для правядзення наступных работ:**

дэмантаж, устаноўка, замена ці перанос сістэм халоднага і гарачага вода-, газа-, электразабеспячэння, ацяплення, водаадвядзення (каналізацыі), смеццевыдалення, газавыдалення, вентыляцыі, у тым ліку электрычнага, санітарна-тэхнічнага, ацяпляльнага, газавага абсталявання і ацяпляльных прыбораў; перанос так званага змеевіка, мантаж гідра-, пара-, цепла- і гукаізаляцыі; змяненне апорных канструкцый і канструкцый падлогі.

**Узгадненне (дазвол) мясцовага выканаўчага і распарадчага органа без распрацоўкі праекта патрабуецца для правядзення работ па:**

змяненні плошчы, колькасці жылых пакояў і падсобных памяшканняў у кватэры з захаваннем функцыянальных зон за кошт разборкі існуючых і (або) усталявання новых перагародак; змяненні плошчы і колькасці памяшканняў у ізаляваных нежылых памяшканнях з захаваннем функцыянальных зон за кошт разборкі існуючых і (або) усталявання новых перагародак; прабіванні, павелічэнні праёмаў у перагародках.

**Віктар САВІЦКІ.**

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

■ На клетачным узроўні

# ХВОРАЯ ХРАМАСОМА,

## АБО ЯКІЯ ГЕНЕТЫЧНЫЯ ЗАХВОРВАННІ МОЖНА ПАПЯРЭДЗІЦЬ У БЕЛАРУСКІХ ДЗЯЦЕЙ?

**Што агульнага паміж сіндромам Даўна і, скажам, фенілкетунурыяй? Абодва захворванні адносяцца да генетычных. Звычайнаму абывацелю абсалютна незразумела, што і як адбываецца ў генах, чаму ў нашых клетках здараецца збой, які прыводзіць да парокаў развіцця ў плода. На самой справе, і вучоным не ўсё да канца вядома. Паспрабуем жа разабрацца з тым, што ўжо даследавана, і пашукаць адказы на пытанні: чаму ўсё ж такі здараюцца збоі і што прапануецца ў якасці лячэння пры генетычна абумоўленых паталогіях? Тлумачыць наменік дырэктара па медыцынскай генетыцы Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Ірына НАВУМЧЫК.**

— Сёння вядома некалькі тысяч захворванняў, пры якіх парушэнні ў органах і сістэмах звязаны з пэўнымі зменамі ў спадчынным апараце, у нашых генах. Спадчынны апарат, як мы памятаем з біялогіі,— гэта сістэма ДНК. Кожная клетка арганізма мае ядро з храмасомамі, а храмасомы складаюцца з ДНК. Гэта ёсць гены, якія кантралююць тую ці іншую біяхімічную рэакцыю або функцыю ў арганізме. У кожнага чалавека свой набор генаў, хоць у цэлым генатып ва ўсіх людзей падобны.

Наш генетычны апарат можа натуральным чынам змяняцца — толькі адны змены будуць досыць нейтральнымі, другія стануць фактарам схільнасці да захворвання, а трэція абумовяць развіццё захворвання.

Па-першае, генетычныя змяненні можна атрымаць у спадчыну, ад бацькоў, якія не мелі генетычнага захворвання, але былі носьбітамі змененых генаў. Па-другое, змены з нейкіх прычын узнікаюць у палавой клетцы аднаго з бацькоў і перадаюцца будучаму дзіцяці ў момант зачацця. Па-трэцяе, змены ў клетках плода могуць узнікнуць і без «удзелу» бацькоў — самі па сабе, на самых ранніх стадыях развіцця, калі зарадзілася новае жыццё і пачалося актыўнае дзяленне клетак. Новы арганізм толькі пачаў развівацца — і раптам штосьці парушылася: у генах з'явіліся змены, якія ў будучыні могуць абумовіць ці дакладна стануць прычынай генетычнага захворвання.

**З мэтай прафілактыкі бессэнсоўна і нерэальна абследаваць усё насельніцтва на наяўнасць змененых генаў. Тым не менш, акрамя даследавання па клінічных паказаннях, у рэспубліцы існуюць дзве масавыя дыягнастычныя праграмы для немаўлят і будучых матуль.**

Сёння існуе ўмоўнае дзяленне генетычных хвароб. Адна група — гэта захворванні, звязаныя са змяненнем колькасці і структуры храмасом. Так узнікаюць сіндром Даўна і шэраг больш цяжкіх станаў затрымкі псіхафізічнага развіцця, а таксама некаторыя вельмі цяжкія парокі ўнутраных органаў. Другая група — гэта захворванні, звязаныя са зменамі ў адным гене. Зменены ген можа даць парок развіцця, неўралагічнае або функцыянальнае парушэнне. Са зменамі ў адным гене звязаны і хваробы, якія адносяць у асобную, трэцюю групу і якія праяўляюцца парушэннем абмену рэчываў. Гэта, напрыклад, фенілкетунурыя.

**— Якія генетычныя захворванні сустракаюцца найчасцей?**

— Парокі фізічнага развіцця — парок сэрца або лішні пальчык на руцэ, расшчыліны губы ці паднябення… Наогул каля 2–3 працэнтаў немаўлят маюць такія парокі. Адны з іх — напрыклад, парокі сэрца,— патрабуюць тэрміновага хірургічнага лячэння. Іншыя могуць быць выпраўлены не адразу. Разам з тым ёсць настолькі цяжкія парокі, пры якіх сучасная медыцына не ў стане аблегчыць стан хворага. А наогул ёсць і такія генетычныя хваробы, якія сустракаюцца вельмі рэдка — 1 выпадак на 500 тысяч насельніцтва…

**— Зменлівасць генетычнага апарату натуральная для чалавечай прыроды або тут прасочваецца нарастанне шкоднага ўздзеяння знешніх фактараў?**

— Змяненне генетычнага матэрыялу цалкам натуральнае і ўласцівае ўсяму жывому. Парокі развіцця сустракаюцца прыкладна з аднолькавай частатой у розных краінах. Спадчынныя захворванні таксама сустракаюцца ва ўсіх краінах, хоць частата некаторых з іх можа адрозніваецца ў розных народаў. Знешнія фактары, безумоўна, уплываюць на нас, аднак нельга назваць іх сярод дакладных прычын зменлівасці генаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**— Якім чынам праводзіцца дыягностыка?**

— Прымяняюцца найперш лабараторныя метады. Сярод спецыфічных метадаў можна назваць аналіз храмасом. Праводзіцца ён з дапамогай розных методык. Для выяўлення парушэння абмену рэчываў выкарыстоўваецца біяхімічны метад даследавання крыві, паколькі нам добра вядома, што менавіта трэба шукаць у крыві пры падазрэнні на такія парушэнні. Мы шукаем пэўны фермент, работа якога відавочна парушана. Вельмі хутка развіваюцца зараз і малекулярна-генетычныя даследаванні — аналіз непасрэдна ДНК. Вызначэнне мутацый у генах або пошук пэўных маркёраў робіць магчымым дакладнае выяўленне самых розных спадчынных захворванняў або спадчыннай схільнасці.

У нашым цэнтры прымяняюцца сёння многія методыкі, але ж, вядома, не ўсе, што ажыццяўляюцца ў свеце. Аб некаторых спецыфічных методыках, якія ёсць у маскоўскіх клініках, мы паведамляем пацыентам. Калі ёсць жаданне ўдакладніць або пацвердзіць дыягназ там — гэта іх права.

**— «Генетычны» пацыент трапляе ў поле зроку ўрача толькі пры з'яўленні нейкіх сімптомаў?**

— Так, і яго накіроўваюць на кансультацыю ў абласны медыка-генетычны цэнтр ці ў наш цэнтр «Маці і дзіця». Генетык вызначае той пералік даследаванняў, які спатрэбіцца для ўдакладнення дыягназу. З мэтай прафілактыкі бессэнсоўна і нерэальна абследаваць усё насельніцтва на наяўнасць змененых генаў. Тым не менш, акрамя даследавання па клінічных паказаннях, у рэспубліцы існуюць дзве масавыя дыягнастычныя праграмы для немаўлят і будучых матуль. Усе нованароджаныя ў нашай краіне масава абследуюцца на фенілкетунурыю (паталогія, пры якой не засвойваецца бялок, а значыць, патрабуецца, пераход на спецыяльнае харчаванне) і гіпатырыёз (патрабуе пастаяннага прыёму гармонаў шчытападобнай залозы). Абодва захворванні маюць досыць надзейныя метады прадухілення сваіх праяў у выпадку своечасова пачатага лячэння, на працягу першага месяца жыцця. Дыягностыка праводзіцца па крыві.

Існуе і скрынінг цяжарных — трохразовае ўльтрагукавое абследаванне, біяхімічны аналіз крыві ў першым трыместры цяжарнасці (сёння праводзіцца ў РНПЦ «Маці і дзіця»). Гэта дапамагае выявіць парокі развіцця ў плода. Пры першых падазрэннях сям'я мае магчымасць дадатковага кансультавання, напрыклад, у кардыяхірургаў, хірургаў пры неабходнасці аператыўнага ўмяшання. Скрынінг дазваляе выявіць і групу рызыкі жанчын, плод у якіх можа мець храмасомнае захворванне, якое фактычна заўсёды суправаджаецца затрымкай разумовага развіцця. Такім жанчынам праводзіцца даследаванне храмасом плода. Пры выяўленні цяжкіх паталогій сям'я можа прыняць рашэнне аб перарыванні цяжарнасці.

**— Якім можа быць лячэнне генетычнай паталогіі?**

— Мы не можам змяніць арганізм такім чынам, каб знікла генетычная аснова захворвання, а таму прапануецца толькі сімптаматычнае лячэнне. Прымяняецца хірургічная карэкцыя (пры пароках), медыкаментозная падтрымка функцый органаў — замяшчальная тэрапія (гармонамі пры гіпатырыёзе). У свеце вядуцца работы па выкарыстанні ствалавых клетак для лячэння генетычнай паталогіі. У РНПЦ дзіцячай анкалогіі,

**Наогул каля 2–3 працэнтаў немаўлят маюць такія парокі. Адны з іх — напрыклад, парокі сэрца,— патрабуюць тэрміновага хірургічнага лячэння. Іншыя могуць быць выпраўлены не адразу.**

гематалогіі і імуналогіі ствалавыя гемапаэтычныя клеткі выкарыстоўваюцца для лячэння пярвічных імунадэфіцытаў. У свеце ствалавыя клеткі перасаджваюць і пры некаторых іншых спадчынных захворваннях — з рознай эфектыўнасцю. Вядуцца і актыўныя спробы па атрыманні штучных ферментаў. Але нельга думаць, што гэта будзе панацэяй. Першыя спробы атрымання ферментаў паказваюць не толькі высокі кошт выкарыстання такіх методык, але і цяжкасці з іх прымяненнем. Размова ідзе ўсё ж такі аб унутрывенным шляху ўвядзення. Да таго ж пры адных захворваннях увядзенне ферментаў забяспечвае добры вынік, а пры іншых не такі выражаны эфект, як хацелася б. Трэба памятаць і аб тым, што такія прэпараты ўсё роўна будуць толькі прыпыняць развіццё захворвання, але не пазбаўляць яго.

Развіваецца ў свеце і генатэрапія — вядуцца спробы атрымаць «штучныя» гены і ўвесці іх у арганізм так, каб яны працавалі ў патрэбным органе. Для кожнай паталогіі гэта павінен быць, вядома, свой ген. Калі генатэрапія атрымае развіццё, тады можна будзе весці размову аб выдаленні менавіта прычыны захворвання. Пакуль гэта досыць аддаленая перспектыва.

**— Ці існуюць новыя распрацоўкі ў галіне паляпшэння дыягностыкі?**

— Пошукам новых малекулярных характарыстык, характэрных для таго ці іншага генетычнага захворвання, займаюцца ў тым ліку і даследчыкі нашага цэнтра.

**— Любы чалавек баіцца цяжкіх паталогій. Аднак тут немагчыма гаварыць аб прафілактыцы. Што ўсё ж такі павінен мець на ўвазе кожны з нас?**

— Цяжкія паталогіі пагражаюць значным пагаршэннем якасці жыцця, раптоўным лятальным зыходам, а таму нашы страхі небеспадстаўныя. З другога боку, многія генетычныя захворванні выпраўляюцца нават проста сімптаматычным лячэннем. Такія людзі і працуюць, і ў пэўных выпадках раджаюць здаровых дзяцей.

Калі ж у сям'і ёсць нейкае вядомае спадчыннае захворванне, прыкметы, якія даюць падставы падазраваць такую сітуацыю, ёсць сэнс падчас планавання цяжарнасці пракансультавацца з урачом-гінеколагам, атрымаць накіраванне да ўрача-генетыка. Можна запісацца і адразу да такога спецыяліста. Генетыкі ёсць ва ўсіх абласных цэнтрах. Пацыентаў Мінска і Мінскай вобласці накіроўваюць у цэнтр «Маці і дзіця».

**— Здаецца, няма ніводнага саматычнага, псіхічнага захворвання, у развіцці якога не прасочвалася б спадчынная схільнасць…**

— Што датычыцца, напрыклад, псіхіятрыі, развіцця інтэлекту, тут найцяжэй выявіць адназначныя генетычныя моманты. Чым складаней работа органа ці функцыі, тым больш генаў удзельнічае ў забеспячэнні гэтай работы, а значыць, больш момантаў трэба ўлічваць падчас вывучэння. У цэлым спадчынная схільнасць значыцца сярод фактараў рызыкі развіцця фактычна любога захворвання. Праявіцца апошняе ці не — у многім залежыць ад ладу жыцця чалавека. Ад умоў працы і адпачынку, умення спраўляцца са стрэсамі, наяўнасці шкодных звычак, узросту і г. д.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Погляд знутры

# «МЫ НЕ МОЖАМ СЯДЗЕЦЬ ПА ДАМАХ І ПАСТАЯННА ПЛАКАЦЬ»

**У 2010 годзе ў нашай краіне было зарэгістравана Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская арганізацыя хворых на мукаполіцукарыдоз і іншыя рэдкія генетычныя захворванні». З таго часу ўдалося вельмі многае зрабіць для таго, каб кожная хвіліна жыцця «рэдкіх» цяжкахворых дзяцей давалася іх бацькам без слёз. Самую розную карысную інфармацыю аб дапамозе генетычна хворым дзецям і па доглядзе іх можна атрымаць на сайце www.mpssociety.by.**

— У мяне ўжо дарослая дачка, з якой мы прайшлі няпросты шлях,— кажа **старшыня Беларускай арганізацыі хворых на мукаполіцукарыдоз і іншыя рэдкія генетычныя захворванні Тамара МАЦІЕВІЧ.**— Адукаваная, разумная дзяўчына. Але я не змагу вам патлумачыць, што такое пачуць: «Мама, я не магу ўстаць з ложка»… Так мы пераселі ў інваліднае крэсла… У нашай краіне ўсяго 8 чалавек з такім дыягназам, як у маёй дачкі.

Генетычныя захворванні развіваюцца працягла. Пэўны час можа быць усё добра, але аднойчы — праз месяц, ці год, ці пяць — выстаўляецца дыягназ. Гэтыя людзі, як і хворыя з іншымі генетычнымі паталогіямі,— не псіхічна хворыя. У некаторых выпадках інтэлектуальныя здольнасці пачынаюць зніжацца, што можна заўважыць у паводзінах, выразе твару. Але гэта не мае дачынення да псіхічных захворванняў. Калі сітуацыя са здароўем дзіцяці значна пагаршаецца, страчваецца магчымасць наведваць школу, парушаюцца стасункі з навакольнымі. Многія дарослыя пры гэтым проста замыкаюцца. Сёння я шмат чаго ведаю і імкнуся перадаць хоць бы нейкія веды іншым, хто сутыкнуўся з падобнай праблемай…

Мы стварылі нашу арганізацыю для азнаямлення грамадства з праблемамі генетычна хворых, а таксама для вырашэння гэтых праблем. Усе генетычныя хворыя могуць абследавацца у РНПЦ «Маці і дзіця». Акрамя таго, мы маем доступ да лепшых спецыялістаў самых розных спецыяльнасцяў у іншых рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах. Аднак, на жаль, няма спецыялістаў, здольных дапамагаць генетычна хворым комплексна, з улікам асаблівасцяў працякання менавіта самога генетычнага захворвання. Вось чаму на ўзроўні Міністэрства аховы здароўя наша арганізацыя актыўна абмяркоўвае пытанне стварэння спецыяльнага цэнтра, які значна аблегчыць жыццё хворым.

**Генетычныя захворванні развіваюцца працягла. Пэўны час можа быць усё добра, але аднойчы — праз месяц, ці год, ці пяць — выстаўляецца дыягназ.**

Генетычныя захворванні няўхільна прагрэсуюць. Больш ці менш павольна. Бацькі пастаянна ў напружанні. Да апошняга дня ў некаторых выпадках дзіця знаходзіцца дома, у тым ліку калі пераходзіць на штучнае дыханне і харчаванне. Матулі 24 гадзіны не адрываюцца ад ложка. Зразумела, што тут неабходна прафесійная псіхалагічная падтрымка.

Ферментазамяшчальная тэрапія — не панацэя, але працягвае жыццё, прыпыняе захворванне. Інсулін — таксама фермент, які прыпыняе развіццё цукровага дыябету, аднак ён патрэбны вялікай колькасці людзей, а таму даступны па кошце. Наша тэрапія — вельмі дарагая. Вось мы і ўздымаем на ўзроўні Міністэрства аховы здароўя пытанне набыцця патрэбных ферментаў.

Спачатку мы наогул дабіліся вяртання расходаў за падгузкі, павышэння сацыяльных дапамог. Потым вырашылі пытанне забеспячэння спецыяльным харчаваннем хворых на ацэдэмію. Вельмі хутка павінна вырашыцца і пытанне па прадастаўленні бясплатных перавязачных матэрыялаў і мазяў (пры такой генетычнай паталогіі, калі цела пакрываецца язвамі і выкарыстанне любых іншых матэрыялаў не ўяўляецца магчымым). Гэта неабходна сёння для 13 чалавек. Стала магчымай і рэабілітацыя нашых дзяцей — праўда, пакуль акрамя ляжачых. Патрэбны нам яшчэ спецыяльныя каляскі, сядзенні для купання і іншыя прыстасаванні айчыннай вытворчасці…

Паводле слоў **Дзяніса,** бацькі дзяўчынкі з генетычным захворваннем, абавязкова павінны быць медыкі, якія будуць назіраць дзіця ад моманту пастаноўкі дыягназу да яго апошніх дзён.

Жонка Дзяніса — **Вікторыя** — дадае: «Сёння я магу сказаць, што не адчуваю сябе сам-насам з такім выпрабаваннем. Тамара Мікалаеўна — наша ратаванне, бо ўцягнула ў работу па дапамозе іншым».

Двое дзяцей з розніцай у адзін год і аднолькавым няпростым дыягназам — у **Наталлі:** «12-гадовае дзіця можа паводзіць сябе як 7-гадовае. Навакольныя гэта бачаць і не праяўляюць належнай лаяльнасці. Ні грамадства, ні спецыялісты пакуль не разумеюць нас. Дыягназ пра абодвух дзяцей мне паведамілі па тэлефоне. Я нічога не зразумела. Жыццё проста падзялілася на «да» і «пасля». Было так балюча… Але ж мы не можам сядзець па дамах і пастаянна плакаць».

— Напрыканцы студзеня плануем арганізаваць сустрэчу з удзелам кіраўніцтва міністэрстваў аховы здароўя, сацыяльнай абароны, медыкаў і бацькоў, каб абмеркаваць, што нам патрэбна рабіць далей,— кажа Тамара Мікалаеўна.— Ведаеце, з захапленнем назіраю за паралімпійцамі, якія дабіваюцца вялікіх спартыўных вынікаў. Нашы дзеці не могуць круціць каляску, але нешта ўсё ж такі яны могуць рабіць. І наша арганізацыя будзе працаваць над гэтым…

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

# СТАРШАЯ ШКОЛА — НЕ ДЛЯ ЎСІХ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У пэўнай ступені ўсё гэта вядзе да сацыяльнай напружанасці. Школа для жыхароў вёскі з'яўляецца адукацыйным і культурным цэнтрам, а разам з яе закрыццём вёскі губляюць адукацыйна-выхаваўчы асяродак. Да таго ж у сельскіх школах працуюць 88 аб'яднанняў па інтарэсах, якія ахопліваюць 95% дзяцей і дазваляюць школьнікам цікава арганізаваць свой вольны час і развіваць свае здольнасці.

Звярнула Таццяна Балдышэўская ўвагу і яшчэ на адну праблему, якая ўзнікла нечакана — **аплату за праезд па платных аўтадарогах.** Так атрымалася, што школьныя аўтобусы, напэўна памылкова, выпалі з пераліку транспартных сродкаў, якія вызваляюцца ад аплаты. Але з 1 студзеня 2014 года дарога, па якой школьны аўтобус збірае дзяцей па навакольных вёсках і адвозіць іх у школу, становіцца платнай...

— Хацелася б вярнуцца таксама да безадзнакавага навучання ў пачатковай школе па такіх прадметах, як выяўленчае мастацтва, працоўнае навучанне, музыка і фізічная культура. Настаўнікі і бацькі выходзяць з прапановай — вярнуць у 3—4-х класах адзнакі па гэтых прадметах па 10-бальнай шкале, паколькі безадзнакавая сістэма зніжае цікаўнасць вучняў да гэтых дысцыплін, а настаўнікі вымушаны запаўняць вялікую колькасць усялякіх папер па ўліку бягучай і прамежкавай атэстацыі, — заўважыла Таццяна Балдышэўская.

Яшчэ адна праблема — агульная для ўсіх сельскіх школ. Пасля таго як сярэдняя школа пераўтвараецца ў базавую, а базавая — у пачатковую, установы адукацыі вымушаны праходзіць дзяржаўную акрэдытацыю. Але навошта? Калі б усё было наадварот — пачатковая школа пераўтварылася ў базавую ці сярэднюю, — то гэтаму можна было б яшчэ знайсці тлумачэнне. Таму, на думку кіраўнікоў устаноў адукацыі, акрэдытацыю мэтазгодна было б пакінуць толькі для новастворaных гімназій і ліцэяў.

## РОЗНАЎЗРОСТАВЫЯ КЛАСЫ ДЛЯ СЕЛЬСКІХ ШКОЛ

**Наменік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Ігар ЖУК** лічыць, што трэба для малакамплектных школ увесці паняцце «класы-камплекты», што дазволіць аб'яднаць на першай ступені адукацыі рознаўзроставыя малакольскасныя класы ў класы-камплекты па ўсіх вучэбных прадметах. А на другой ступені адукацыі трэба прадугледзець магчымасць аб'яднання школьнікаў у класы-камплекты на ўроках фізічнай культуры і працоўнага навучання. У Кодэкс аб адукацыі трэба таксама ўнесці норму, якая дазваляла б у дзяржаўных установах дашкольнай адукацыі адкрываць групы на гаспадарчаразліковай аснове, а таксама разгледзець магчымасць у будучым адкрываць на гаспадарчаразліковай аснове таксама і дзяржаўныя дашкольныя ўстановы.

Кодэкс аб адукацыі, на думку кіраўніцтва вобласці, трэба таксама дапоўніць нормай аб кампенсацыі выдаткаў за навучанне маладымі людзьмі, якія навучаліся ва ўстановах прафтэхадукацыі, але былі адлічаны па ўласным жаданні, што дазволіць, з аднаго боку, стымуляваць акадэмічную паспяховасць, а з іншага, павысіць адказнасць абітурыентаў пры выбары будучай прафесіі.

— У сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі намецілася трывожная тэндэнцыя росту колькасці адлічаных навучэнцаў, якія робяць гэта, так бы мовіць, без уважлівых прычын. За адзін навучальны год толькі па Гродзенскай вобласці адлічваюцца крыху больш як 4% ад тых, хто паступіў на вучобу. Склалася практыка, калі маладыя людзі, што правучыліся амаль увесь тэрмін, за некалькі тыдняў да атрымання дыплома пішуць заяву з хадайніцтвам аб адлічэнні. Фактычна маладыя людзі прафесію ўжо набылі, але юрыдычна яны выходзяць такім спосабам з-пад персанальнага размеркавання, — патлумачыў Аляксандр Жук. — Сёння мы не можам істотна паўплываць на каналы размеркавання выпускнікоў сярэдняй школы. Але я глыбока перакананы ў тым, што ўстанаўленне парога сярэдняга бала пры прыёме на трэцюю ступень агульнаадукацыйнай школы будзе спрыяць павелічэнню колькасці моладзі, якая атрымлівае рабочыя прафесіі, і, адпаведна, змяншэнню дэфіцыту рабочых кадраў. Механізм рэалізацыі гэтай прапановы трэба будзе абмеркаваць...

Закрануў Аляксандр Жук таксама і лёс вучэбна-метадычных кабінетаў, якія працуюць сёння фактычна па-за прававым полем. Таму трэба ўнесці ў Кодэкс аб адукацыі раздзел аб статусе і функцыях метадычных кабінетаў.

## АПТЫМІЗАЦЫЯ ЦІ ШКОДНІЦТВА?

**Наменік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Міхаіл ВОЛКАЎ** агучыў сваё бачанне механізму адбору ў старшую школу:

— Прапаную ў 9-м класе школьныя экзамены адмяніць, таму што яны носяць выключна фармальны характар. Усе вучні прыходзяць і атрымліваюць на экзамене тыя адзнакі, якія ім патрэбны. Пасля 9-га класа трэба праводзіць два незалежныя экзамены — па беларускай і рускай мовах, паколькі ў Беларусі дзве дзяржаўныя мовы. У якой форме праводзіць экзамены, няхай вырашае Міністэрства адукацыі. Тым жа, хто мае намер навучацца ў 10-м класе, трэба здаць уступныя экзамены, напрыклад, па фізіцы і матэматыцы або па біялогіі і хіміі — у залежнасці ад абранага профілю. У старшых класах павінны навучацца толькі матываваныя дзеці. Няма нічога страшнага, калі хтосьці атрымае агульную сярэднюю адукацыю ў прафтэхустанове разам з рабочай прафесіяй. Прафесійна-тэхнічную адукацыю атрымлівалі многія славутыя людзі — напрыклад, акадэмік Сяргей Каралёў і Юрый Гагарын.

Акрамя таго, парламентарый закрануў і пытанне аптымізацыі сістэмы адукацыі. Міхаіл Волкаў падкрэсліў, што аптымізацыя можа быць не толькі натуральнай, але і штучнай. Асноўная мэта аптымізацыі — павышэнне эканамічнай эфектыўнасці і якасці работы ўстаноў адукацыі. А калі асноўныя задачы не вырашаюцца, то гэта, хутчэй, шкодніцтва, чым аптымізацыя. Нярэдка эканомія ад закрыцця ўстаноў адукацыі ўвогуле аказваецца эфемернай.

**Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Брэсцкага райвыканкама Анатоль ЦІМАШЭНКА** звярнуў увагу на тое, што вывучэнне ў старшых класах асобных прадметаў на павышаным узроўні дазволена ўсяго толькі лістом Мінадукацыі і не замацавана ні ў адным нарматыўным дакуменце. А гэта не можа спрыяць пашырэнню практыкі адкрыцця профільных класаў. Да таго ж і чатыры профілі, што прапанавала міністэрства, не могуць у поўным аб'ёме ўлічыць запыты школьнікаў у вывучэнні на павышаным узроўні тых ці іншых прадметаў.

— У вучэбным працэсе сёння актыўна выкарыстоўваюцца новыя камп'ютарныя класы, інтэрактыўныя дошкі, мультымедыйныя праектары. Пры такой колькасці сучаснай тэхнікі ўзнікае праблема з яе абслугоўваннем і суправаджэннем шматлікіх праграмных прадуктаў. Часткова гэтую праблему вырашае ў Брэсцкім раёне рэсурсны цэнтр інфармацыйных тэхналогій. Аднак наспела неабходнасць распрацаваць палажэнне аб дзяржаўнай арганізацыі адукацыі, якая ажыццяўляе інфармацыйнае забеспячэнне ўстаноў адукацыі. Адсутнасць вышэйзгаданага палажэння стрымлівае развіццё інфармацыйных цэнтраў і суправаджэнне сродкаў навучання, — упэўнены Анатоль Цімашэнка.

Якія яшчэ прапановы па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы ў сістэме адукацыі гучалі ў Авальнай зале парламента:

— дазволіць школам арганізоўваць на старшай ступені мультыпрофільнае навучанне;

— канкрэтызаваць інструкцыю аб парадку арганізацыі падвозу навучэнцаў;

— дазволіць выхавацелям дашкольных устаноў, якія маюць педагагічную, але не профільную адукацыю, атрымліваць кваліфікацыйныя катэгорыі;

— вярнуць у школьныя вучэбныя планы прадмет «Сусветная мастацкая культура»;

— стварыць адзіную нацыянальную бібліятэку адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў;

— стварыць нарматыўна-заканадаўчую базу для арганізацыі гнуткага дыстанцыйнага навучання;

— прадаставіць установам вышэйшай адукацыі істотна большую свабоду ў выбары зместу, формаў і тэхналогій адукацыйнага працэсу;

— узаконіць партнёрства бізнесу і ўстаноў адукацыі;

— прыцягваць патэнцыяльных працадаўцаў да распрацоўкі адукацыйных стандартаў;

— дазволіць школьным медалістам і пераможцам абласнога тура рэспубліканскіх прадметных алімпіяд паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без здачы экзаменаў;

— правесці навуковыя даследаванні па ўплыве на здароўе дзяцей і падлеткаў інфармацыйных тэхналогій;

— вярнуцца да падрыхтоўкі медыцынскіх сёстраў на базе 9 класаў, каб на год раней выпускаць спецыялістаў для сістэмы аховы здароўя.

## НЕПРЫЦЯГАЛЬНАЯ ДЛЯ МОЛАДЗІ ПРАФЕСІЯ

Сваёй трывогай, якая «пераходзіць у адчай», падзялілася з усімі прысутнымі **настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 10 г. Светлагорска Надзея САФРОНЕНКА:**

— З цягам часу склалася так, што педагагічныя калектывы маюць пераважна жаночае аблічча. Але якую штотыднёвую нагрузку могуць вытрымаць «моцныя» жаночыя плечы? Настаўнік, які працуе на 1,5—2 стаўкі, заняты на працягу дня з 8 да 17 гадзін. Калі працаваць на стаўку, то, безумоўна, працоўны дзень будзе значна меншы. Але як пражыць на зарплату ў 2- 2,5 млн рублёў? Вяртаючыся са школы пасля 6-7 урокаў, жанчына-педагог дзве гадзіны (а філолагі значна больш) выдаткоўвае на праверку сшыткаў, каля 2—3 гадзін рыхтуецца да ўрокаў. **Значыць, настаўнік штодня мае нагрузку 10—12 гадзін! Але ці можна быць упэўненым у якасці выкладання пры такім вялікім аб'ёме работы?** А калі настаўнік выступае яшчэ і ў ролі класнага кіраўніка? Класны кіраўнік не толькі праводзіць разнастайныя выхаваўчыя мерапрыемствы, але і афармляе вялікую колькасць папер, справаздач, актаў, характарыстык, таму і знайсці педагога, які па ўласным жаданні пагадзіўся б працаваць класным кіраўніком, няпроста. **Вырашэнне праблемы перагрузкі педагогаў — задача задач сучаснай школы.**

**Гледзячы на вялікую колькасць абавязкаў і безнадзейнасць у вачах настаўніка, выпускнікі школ не жадаюць выбіраць гэтую прафесію...**

Не хачу пакрыўдзіць сваіх калег, якія выкладаюць музыку, маляванне, працоўнае навучанне, фізічную культуру, але, пагадзіцеся, што падрыхтоўка да ўрока матэматыкі, фізікі, хіміі, рускай, беларускай, замежнай мовы несупастаўная з падрыхтоўкай да ўрокаў музыкі або малявання. І адказнасць — розная: я маю на ўвазе выпускныя экзамены, ЦТ, падрыхтоўку вучняў да алімпіяды. Таму, напэўна, трэба падумаць аб дыферэнцыяваным падыходзе пры вызначэнні гадзін на стаўку для настаўнікаў-прадметнікаў.

Да таго ж, як заўважыла Надзея Сафроненка, акрамя асноўных абавязкаў, рэгламентаваных службовай інструкцыяй, настаўнік выконвае безліч даручэнняў і загадаў разнастайных службаў, камітэтаў, устаноў, інспекцыі па справах непаўналетніх...

— Упэўнена, што **павінна быць супрацоўніцтва, а не перакладванне абавязкаў на плечы настаўніка.** Хочацца, каб у гэтым кірунку былі зроблены канкрэтныя захады з мэтай вызвалення педагогаў ад неўласцівай ім работы, — падкрэсліла школьная настаўніца.

Па словах Алены Сафроненка, апошнім часам шмат нараканняў гучыць у адрас педагогаў: маўляў, не рыхтуюць сабе годную змену... Але гледзячы на вялікую колькасць абавязкаў і безнадзейнасць у вачах настаўніка, выпускнікі школ не жадаюць выбіраць гэтую прафесію, якую б агітацыйную работу ні праводзілі педагогі. Як вынік — **у Мазырскім педагагічным універсітэце ў гэтым годзе на 14 спецыяльнасцяў конкурс не адбыўся, а на 6 спецыяльнасцяў не было пададзена ўвогуле ніводнай заявы.**

Пагаршае становішча настаўнікаў і ўвядзенне новай інструкцыі аб атэстацыі.

— Мы зусім не супраць удасканалення гэтага працэсу. Але хочацца, каб настаўнікі, якія працуюць на вынік, выхоўваюць пераможцаў алімпіяд, лаўрэатаў розных конкурсаў, мелі хоць бы невялікія прывілеі перад іншымі педагагічнымі работнікамі — і не толькі пры праходжанні атэстацыі на прысваенне ці пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі. Пры ацэнцы іх працы, пры налічэнні пенсіі таксама не павінна быць «ураўнілаўкі».

## АДСУТНАСЦЬ ФІНАНСАВЫХ АРЫЕНЦІРАЎ

— Ёсць праблема ў тым, што ў нас няма дакладных заканадаўчых арыенціраў як у фінансаванні галіны, так і ва ўзроўні аплаты працы педагагічных работнікаў. Гэта наша галоўнае пытанне па Кодэксе аб адукацыі, паколькі сістэма плаціць занадта высокую цану за адсутнасць такіх артыкулаў у заканадаўстве. Цана пытання — кадры і якасць адукацыі, за якімі стаіць якасць жыцця ў краіне, — падкрэсліў у сваёй прамове **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Раней у артыкуле 52 Закона «Аб адукацыі» змяшчалася норма аб накіраванасці дзяржаўнай палітыкі на дасягненне ўзроўню сярэднямесячнай заработнай платы педагагічных работнікаў не ніжэй за ўзровень у прамысловасці, а прафесарска-выкладчыцкага саставу — не менш чым у 1,5 раза вышэй за гэты ўзровень. Артыкул 53 закона прадугледжваў устанаўленне аб'ёмаў бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне і развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі ў памеры не менш як 10% ад валавога ўнутранага прадукту. На жаль, такія нормы Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі не змяшчае.

Што мы назіраем сёння? Аб'ём бюджэтнага фінансавання галіны знізіўся з 7% ВУП у 2004 годзе да 4,9% ВУП у 2012 годзе. Дэпутацкі корпус не змог адстаяць адпаведныя нормы ў Кодэксе, а такія арыенціры ўсё ж павінны быць.

Таксама Аляксандр Бойка выказаўся і па вельмі актуальнай для ўсіх педагогаў праблеме — выкананні неўласцівых ім абавязкаў. І прывёў у якасці прыкладу норму Закона «Аб адукацыі» Украіны, згодна з якой адцягванне педагагічных і навукова-педагагічных работнікаў ад выканання прафесійных абавязкаў не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

# Калі канчаецца соль...



Гэта найчасцей робіцца заўважным у адзін з выхадных, бо і сняданак тады гатуецца адмысловы, і абед варыцца поўны, і часта яшчэ да вячэры, на падвячорак, пячэцца які-небудзь французскі «перавернуты» пірог ці фанабэрыстая памяшчака з грыбамі і соусам бешамель... Ну люблю я такія справы і такія стравы. А назвы кулінарныя ўвогуле збіраю. Інакш не рабіла б трэці год запар смачнае шоу для суайчыннікаў-замежнікаў на радыё «Беларусь» — «У сваёй талерцы» называецца...

Дык вось, як канчаецца соль, то я выпраўляюся ў краму, і гэта выглядае як быццам натуральна. Не зусім натуральна выглядае наступнае. Праходжу, значыць, паміж стэлажамі, праз якія шлях да той солі пракладзены, і — ну, быць такога не можа, каб не зацікавіла мяне нешта пабочнае. Новыя ўзоры апетытнага печыва выхопліваюцца зрокам адразу. Тое самае адбываецца з новымі адмысловымі гатункамі сметанковых сыроў, «не пшанічнай» мукі, кандытарскіх маргарынаў і салодкіх упрыгажэнняў. У выніку іду дамоў з поўнай сумкай, але — без солі. Дзе дакладна, на якім менавіта адрэзку крамы здараецца амнезія? Загадка. А самае дзіўнае тое, што паўтараць свой візіт у краму з надзеяй яе апраўдаць і сябе перайначыць — не варта.

Ён з мяне ў такія хвіліны заўсёды смяецца. Дзіва што: у Яго рыбацкім «загашніку» заўсёды ёсць пачак солі.

Сам смяецца, а сам такі самы, як казалі нашы дзеці, калі былі зусім малыя.

Аднойчы я, Ён і яны паехалі на рыбалку.

Добра памятаю, на Бярэзіну. Доўга збіраліся-выбіраліся, доўга пракладалі маршрут, блукаючы сярод прыбярэжных соснаў, доўга потым усталёўвалі намёт, шукаючы ўдалае месца, расстаўлялі «па фэн-шуі» стол, табурэцік і крэсла... Раскладвалі вогнішча, распальвалі прымус, гатавалі вячэру... А як дайшла справа да таго, каб палавіць на досвітку рыбы... Вось-вось, пра галоўнае Ён забыўся. Не, не пра соль, хоць можна было так падумаць. А пра блёсны — яны засталіся адзінока ляжаць у кватэры.

Але той дзень мы правялі зусім няблага. Асабіста я звязала з паўметра карункаў. Наш сярэдні сынок намаляваў пейзаж, за які потым у мастацкай школе атрымаў дыплом другой ступені. Старэйшы з малодшым каталіся ў лодцы і, здаецца, упалявалі страказу. І толькі Ён, муж, бацька і заядлы рыбалоў, не ўспамінае гэты дзень душэўным словам, бо ў блёснах жа была ўся соль.

Што апраўдваецца жыццём, тое не апраўдваецца літаратурай. Гэта я пра соль у любым сэнсе слова. Чытаеш часам рукапіс якогасьці нябогі — і адчуваеш: нішчымны рукапіс, без солі і без перцу. Напісаны, каб толькі надрукавалі, без усведамлення таго факта, што напісанае менавіта з такой матывацыяй якраз і не друкуецца. Як гаварыў «маладосцевец» Дамашэвіч, «Што гэта за герой? Яго ж не намалявалі! Ні носа яму не далі, ні рота — нічога. Як жа яму жыць?».

Што мяне асабліва здзіўляе, дык гэта тое, як можа герой у пісьменніка, нават, здавалася б, майстра, жыць без імені, адно з прозвішчам. Як яму гэта ўдаецца? Неяк даўно, чытаючы кнігу індыйскага пісьменніка Нараяна, даведалася з прадмовы, што Нараян — не прозвішча, а імя. «Р. К. Нараян» — значылася на вокладцы той кнігі, але «Р. К.», якое, дарэчы, варта чытаць як Разіпурам Крышнасвамі, азначае імя «фамільнае», а не ўласнае. А ў чалавеку галоўнае — уласнае імя. Так, прынамсі, сцвярджаюць на Усходзе. У ім — уся соль. «Як вы назавяце лодку...» — гэта, напэўна, таксама недзе адсюль. Астатняе — кандытарскі маргарын і салодкія ўпрыгажэнні.

Пра што я ўвогуле хацела тут сказаць? Пра тое, што пісьменніку без кругагляду — як гаспадыні без солі, як рыбалову без блёснаў, як герою без імені... Напэўна, так

■ Ты, ён і яго хобі

# КАЛІ МУЖ ГУЛЯЕ Ў МАШЫНКІ...

**Вымушаны «дзяліць» вашага мужчыну не толькі з яго роднымі, працай, сябрамі, але і з рыбалкай альбо паляваннем?.. Вы лічыце, што гэта дрэнна і шкодзіць адносінам?.. Вы ў гэтым упэўнены?..**

Многія прадстаўніцы прыгожай паловы, мабыць, здзівяцца, але… мужчынскае хобі часта не толькі не перашкаджае адносінам, але, наадварот, іх умацоўвае. Галоўнае, правільна ставіцца да розных захапленняў сваёй «паловы».

Мае знаёмыя Віталь і Вольга пажаніліся яшчэ студэнтамі. Разам ужо амаль дзесяць гадоў. І столькі ж Віталь збірае мадэлі аўтамабіляў.

«Спачатку я не ўспрымала захапленне мужа ўсур'ёз,— расказвае Вольга,— лічыла яго хобі дзіцячай забавай, якая з цягам часу пройдзе. Але калі праз два гады шлюбу маленькія аўтамабільчыкі розных мадэляў «захапілі» амаль усю нашу кватэру, пачала непакоіцца. Стала цяжка прыбірацца ў пакоях, каб працерці пыл, даводзілася перастаўляць з месца на месца не адзін дзясятак машынак. А яшчэ я вельмі часта за іх чаплялася, і аўтамабільчыкі падалі на падлогу і разбіваліся. І першае, і другое прыводзіла да канфліктных сітуацый з мужам. Я яго папракала, што з-за гэтых цацак вечна не прыбрацца, а ён вельмі засмучаўся, калі парк машынак губляў сваіх «чатырохколых сабратоў». Потым наогул стаў абвінавачваць мяне ў тым, што я спецыяльна скідваю іх на падлогу. Зразумела, што я некалькі разоў вельмі настойліва прапаноўвала яму падарыць усю калекцыю якому-небудь дзіцяці, але Віталь адказваў, што гэты аўтапарк знікне з нашай кватэры толькі разам з ім».

Мужа Вольга кахала і развітвацца з ім не збіралася, таму і вырашыла шукаць кампраміс. У выніку Віталь і Вольга дамовіліся, што ў адным з пакояў будзе адведзена спецыяльнае месца для машынак. А дакладней кажучы — цэлая сцяна, уздоўж якой на паліцах цяпер і стаіць гэты штучны аўтапарк. Прыбірае там муж, а Вольга да машынак нават не падыходзіць.

«Бачыце,— смяецца яна,— можна ж знайсці кампраміс, калі вельмі гэтага захацець!».

А вось Раману і яго жонцы Юліі гэты кампраміс наогул не прыйшлося шукаць. «Юлія — вельмі мудрая жанчына,— расказвае Раман,— і да майго захаплення камп'ютарнымі гульнямі ставіцца паблажліва. І ўсіх іншых жанчын я да гэтага таксама заклікаю: калі ваш муж прыйшоў з працы і гуляе ў танкі ці ў нешта іншае, не спяшайцеся высвятляць адносіны. Такім чынам ён можа здымаць стрэс ці звычайную стомленасць пасля цяжкага працоўнага дня. І лепш, калі муж гэта будзе рабіць за камп'ютарам, чым «выліваючы» незадаволенасць шэфам на вас».

З Раманам не згодна Кацярына:

«Муж чамусьці мае на гэта права — ён стаміўся! А жонка — не?! А калі яна цэлы дзень дома круцілася, як вавёрка, даглядаючы немаўля, прыбіраючыся ў кватэры, гатуючы ежу?.. Можа, ёй неабходна яго дапамога. А калі мужчына прыходзіць і ўтыкаецца носам у камп'ютар, гэта вельмі раздражняе і нават крыўдзіць. Атрымліваецца, што яму няма справы да жонкі і да хатніх турбот?..»

Пры гэтым Кацярына просіць зразумець яе правільна. У самой гульні ў танкі на камп'ютары няма нічога дрэннага, калі гэта мае разумныя межы. Але часта мужчыны праводзяць за такім заняткам занадта шмат часу, не турбуючыся ні аб чым, не цікавячыся ні жонкай, ні дзецьмі, ні тым, што адбываецца ў сям'і. А гэта ўжо дрэнна — і ў першую чаргу для шлюбу.

Аднак з Кацярынай не згодна Алеся:

«А я ўсё ж падтрымаю Рамана. Бо яшчэ горш, калі ў мужчыны… няма ніякіх захапленняў. Калі ён як прывязаны цэлы дзень бадзяецца па кватэры, не ведаючы чым сябе заняць. Да таго ж узнікае яшчэ адна неспадзяваная праблема: такі мужчына патрабуе ад жанчыны пастаяннай увагі, каб увесь яе час цалкам належаў яму. А жонка ж таксама хоча сустрэцца з сяброўкамі, пабыць у адзіноце, падумаць пра нешта выключна жаночае. Яна ж не павінна пастаянна займаць мужа, ёй таксама патрэбна асабістая прастора!

Такім чынам атрымліваецца, што калі ў мужа няма ніякага захаплення, то ён можа перашкаджаць і захапленням жонкі, калі яны ў яе ёсць, і проста «блытацца ў яе пад нагамі».

А гэта таксама можа прывесці да канфліктных сітуацый. Але нават калі ў мужа ёсць хобі, не спяшайцеся, шаноўныя жанчыны, расслабляцца!

«Часта мужчыны, у якіх ёсць хобі, не пакідаюць права на такія ж задавальненні сваім спадарожніцам,— расказвае Аксана.— У мяне, напрыклад, быў выпадак. Сустракалася я з адным мужчынам, адносіны ацэньвала як вельмі сур'ёзныя, таму пачала паціху выпытваць, чым ён займаецца ў вольны час і ці ёсць у яго якое-небудзь хобі (бо ў мяне іх шмат: і танцы, і вышыўка, і заняткі ў трэнажорнай зале). Калі ён адказаў, што ў яго таксама шмат хобі, я шчыра парадавалася. Але, як высветлілася, паспяшалася…

Аксана сказала сябру: маўляў, калі ў цябе столькі хобі (футбол, паляванне, вольная барацьба), мабыць, ты не будзеш супраць, калі я калі-нікалі сустрэнуся з сяброўкамі і пап'ю з імі кавы. Але адказ быў нечаканым: «Як гэта ты з некім будзеш піць каву? Я ж усё кіну і адразу прыеду туды, бо адкуль мне ведаць, што ты з сяброўкамі, а не з іншым мужчынам?».

Пасля гэтага выпадку Аксана ўпэўнілася, што моцны пол шукае забаў толькі для сябе, а любое мужчынскае захапленне — гэта сцвярджэнне мужчынскага права на асабістую свабоду. Пры гэтым жанчына, па меркаванні многіх мужчын, павінна сядзець дома і цярпліва чакаць, калі муж (спадарожнік) вернецца з футбола, палявання ці з рыбалкі.

«Дзе справядлівасць?» — задае рытарычнае пытанне Аксана.

***Тым часам мы вырашылі высветліць у вядомых мужчын, ці ёсць у іх захапленні і як да гэтага ставяцца спадарожніцы жыцця.***

**Павел ТАРАЙМОВІЧ, гурт «Тяни-Толкай»:**

— Я — спартыўны балельшчык. Гляджу спартыўныя тэлеперадачы, хаджу на матчы па хакеі, футболе, гандболе. Мая жонка гэтаму захапленню ніяк не пярэчыць. У нас некалькі тэлевізараў, таму кожны можа глядзець тое, што яму падабаецца. А на хакей яна наогул разам са мной ходзіць. Калі я ездзіў на матчы зборнай па гандболе ў Славакію і Румынію, жонка таксама не была супраць. Зараз у нас маленькае дзіця, а калі падрасце, дык будзем хадзіць на матчы ўтраіх. А пакуль на хакей наведваюся разам з сябрамі.

**Вадзім МЯЗГА, спявак:**

— Са сваіх хобі хацеў бы адзначыць рыбалку і язду на аўтамабілі. На жаль, рыбачыць з-за недахопу часу выпадае не часта, але ж калі-нікалі разам з сябрамі выязджаю на вадаёмы. А вось з яздой на аўтамабілі ўсё прасцей. Я заўсёды знаходжуся ў руху, часта пераязджаю з месца на месца, з горада ў горад, з адной краіны ў другую. Напрыклад, шмат бываю ў Расіі і ва Украіне. Аднак нязручнасцяў амаль не адчуваю, бо гэта мне прыносіць задавальненне. Як бачыце, у мяне дастаткова «бяскрыўдныя» хобі, якія не ўносяць напружанне ў адносіны.

**Мікалай БЕЛАНОВІЧ, гурт «Мінскае мора»:**

— А мне яшчэ прасцей: маё хобі супадае з прафесіяй — гэта музыка! Усе дзяўчаты заўсёды ставіліся да гэтага захаплення станоўча!

**Кірыл ПАЗНЯКОЎ, заснавальнік MSK Fashion Week:**

— А ў мяне гэта — футбол. Любімая каманда з дзяцінства — маскоўскі «Спартак». З дзяўчатамі мне, мабыць, заўсёды шанцавала, бо яны маё захапленне ўспрымалі нармальна. Праўда, здаралася, што іншым разам прыходзілася збягаць на футбол ці ў спартыўны бар, каб паглядзець гульню разам з сябрамі. Аднак і гэта не выклікала ў дзяўчат незадавальнення.

**Гелена АВЕЛА.**



Павел ТАРАЙМОВІЧ.



Вадзім МЯЗГА.



Мікалай БЕЛАНОВІЧ.



Кірыл ПАЗНЯКОЎ.

■ Матуліны занатоўкі

# І дзе ж тая кнопка?

Чым даўжэй у пакоі, дзе малое засталося адно, без нагляду дарослых, пануе цішыня, тым страшней туды заходзіць… У свой час гэтае народнае назіранне неяк абмінула мой сталы розум. І як толькі сын навучыўся вылазіць з калыскі самастойна (якраз на пятым месяцы нашага з ім сумеснага жыцця), я пачала марыць пра тую светлую часіну, калі ён будзе спакойна сядзець на месцы і займаць сябе сам. Бо стамілася безупынна яго «пасвіць».

«Не разумею тваёй праблемы,— пацiскала плячыма сяброўка.— Ты яго распесціла. Вось мае дзеці ніколі не стваралі мне такіх праблем. Бо з нараджэння ведалі: калі маці занятая, трэба ціхенька сядзець у куточку і не перашкаджаць». Лёгка пацiскаць плячыма, калі твае дзеці даўно паўналетнія. А мая сённяшняя рэальнасць — хатняе тарнада, да якога можна толькі прыстасоўвацца.

Ну вось як даць яму зразумець, што я надта занятая? Ужо на другі дзень, як я вярнулася з радзільнага дома ў кампаніі гэтай энергічнай істоты, мы ўсвядомілі, што некалькі наступных гадоў «ціхенька сядзець» у нашай сям'і не давядзецца нікому. Ужо тады сыну хацелася як мага хутчэй выпрабаваць сваё новенькае цельца ў дзеянні. У тры месяцы ён настойліва патрабаваў, каб мы дапамагалі яму «хадзіць». У сем — не горш за Гудзіні навучыўся выкараскваца з усіх страховачных прыстасаванняў крэселка для кармлення. У дзесяць — упэўнена бегаў па кватэры, у год не менш упэўнена залазіў на падаконнік… Зрэшты, прыблізна тады ж ён усё часцей пачаў спыняцца і пільна прыглядацца не толькі да таго, што далёка ці высока, ды і цацкамі стаў цікавіцца не толькі з мэтай пагрызці. Вось яно,— уздыхнула я з палёгкай. Сталее малое! І з асалодай пачала разважаць, якімі цікавымі справамі пачну займацца, пакуль маё дзіця недзе ў куточку будзе збіраць якісьці пазл…



Тымі ж днямі я напаўвока праглядала чарговую кніжку з парадамі маладым бацькам (на спакойнае чытанне ў мяне даўно ўжо не было часу). І з ўсяго тэксту вылучыла і запомніла адну заўвагу: калі дзіця не патрабуе вашага ўдзелу ў яго гульнях, не спяшайцеся сябе навязваць. Маўляў, так яно хутчэй навучыцца самастойнай гульні… Неўзабаве, завіхаючыся на кухні, я адзначыла, што мой сын больш не поўзае побач, патрабуючы ўвагі. Перабраўшыся ў суседні пакой, ён знайшоў сабе нейкі занятак, і ўжо колькі хвілін у нашай кватэры пануе нязвыклая цішыня. Як мне і раілі, я вырашыла не перашкаджаць. Для надзейнасці нават не стала пакідаць кухню… А калі ўсё ж выйшла паглядзець, што менавіта на такі доўгі час паглынула ўвагу майго Антона, заспела карціну, пабачыць якую зусім не была гатова. Пабудаваўшы «лесвіцу» з падушак і крэсла, мая малеча ўскараскалася на стол, уключыла камп'ютар і захоплена ляпала па клавіятуры… Не ведаю, як гэтаму «прасунутаму карыстальніку» такое ўдалося, але ён знішчыў амаль усё камп'ютарнае начынне — большасць праграмных файлаў, і не толькі іх…

Што вы думаеце, жыццё дурніцу навучыла? Мары пра дзень, калі мяне хоць на паўгадзіны пакінуць у спакоі, аказаліся мацнейшымі. І калі ў кватэры зноў усталявалася нязвыклая цішыня, я зноў жа не паспяшалася яе парушаць… У выніку заспела яшчэ адну «карціну маслам». Дакладней, грымам. Аказваецца, у нетрах шафы ўсё яшчэ захоўваўся тэатральны грым, якім мы з сябрамі размалёўваліся на Хэлоўін гадоў 15 таму. І засталося яго шмат — хапіла на ўсяго Антона, ад пятак да самай макаўкі. Ну і яшчэ на паўкватэры, падлога і шпалеры якой набылі надзвычай крэатыўны выгляд. Для тых, хто не ведае пра асаблівасці тэатральнага грыму, заўважу, што сцерці яго можна толькі спецыяльнымі спіртавымі сурвэткамі. А дома нават гарэлкі няма не тое, што спецыяльных сурвэтак… Словам, наш з Антонам візіт у краму ў той дзень запомнілі.

«Ён у нас гіпэрактыўны»,— хваліўся муж сябрам. Мяне ж гэтае моднае слоўца толькі раздражняла. Бо гіперактыўнасць — медыцынскі дыягназ, які мае на ўвазе не столькі шыла ў вядомым месцы, колькі няздольнасць дзіцяці засяродзіцца на якім заўгодна занятку хоць на хвіліну. І, між іншым, ставяць такі дыягназ не больш як 5 працэнтам дзяцей. Але падчас нашых з Антонам візітаў на канцэрт ці выставу, у краму ці паліклініку я безупынна чула зусім іншае: «Які ён у вас спакойны!»

Проста я ведаю, дзе ў яго «кнопка».

Адшукала я тую «кнопку» не адразу. Прыйшлося знайсці час і ўважліва перачытаць адпаведныя кніжкі (дарэчы, дарадца не перашкаджаць дзіцяці ў самастойнай гульні меў на ўвазе трохгадовых), паблукаць па інтэрнэце і заняцца складаннем матэматычных графікаў. Апошняе я рабіла, каб дакладна вызначыць час, калі сын будзе згодны хутка заснуць, і вылічыць, колькі гадзін сну яму патрабуецца. На сайце, дзе я натрапіла на гэтую методыку (вось праўда ўжо не ўяўляю, як людзі жылі без інтэрнэту!), выкладваліся даволі цікавыя вынікі амерыканскіх даследаванняў. Якія сведчылі: наладжаны сон дазваляе пазбавіцца пячаткі «гіперактыўнасць» 75 працэнтам дзяцей (да слова, у Амерыцы гэты дыягназ ставяць часцей, чым дзе яшчэ). Засведчу і я: сон працуе!

Ну і плюс «дыета». Умоўная, але ўсё ж дыета. Амерыканскія (і напэўна, найбольш у нас папулярныя) педыятры Сірсы ў сваіх кніжках нават друкуюць спісы прадуктаў, якія правакуюць капрызлівасць. Калі папросту — дык радзей карміце дзіця салодкім, і будзе вам шчасце. Вунь у Швецыі, напрыклад, печыва і цукеркі дзецям дазволена есці толькі па суботах. І нічога — нікому з юных шведаў у галаву не прыходзіць пачувацца абдзеленымі з гэтай нагоды.

Ёсць яшчэ адзін вельмі дзейсны сродак забяспечыць сабе адносна спакойнае жыццё побач з актыўным нашчадкам «ранняга ўзросту». Трэба ўсяго толькі як мага часцей гуляць разам з ім. І разам жа вучыцца гуляць (у ідэале гэтаму варта навучыцца ўсёй сям'і). І вось тады… Напрыклад, гэты тэкст я здолела напісаць, пакуль мой двухгадовы сын на караблі, пабудаваным з крэслаў, пільнаваў з ліхтарыкам «акул», а потым разганяў іх барабанам, дудкамі і пісталетам. Напярэдадні мы гадзіну гулялі ў «піратаў». І яшчэ гадзіну пірацкі карабель паспяхова дрэйфаваў без мяне…

**Марына БЕРАЗЕНСКАЯ**

■ У чужы манастыр...

# «Міс... курыныя мазгі»,

## АБО СПОСАБЫ ВЫЖЫВАННЯ Ў МУЖЧЫНСКІМ КАЛЕКТЫВЕ



**Многім жанчынам праца сярод мужчын уяўляецца сапраўдным падарункам лёсу. Ім здаецца, што галантныя мужчыны толькі і чакаюць магчымасці саступіць асобе прыгожага полу сваё месца (у тым ліку і крэсла кіраўніка аддзела, напрыклад), і нават гатовы наладжваць дуэлі за права дапамагчы ёй з руціннай працай. Насамрэч, усё не зусім так, таму мы паспрабуем развеяць некаторыя ілюзіі дзеля вашай жа карысці.**

**Ілюзія першая.** У мужчынскім калектыве жанчына заўсёды знаходзіцца пад пільнай увагай. Модныя сукенкі, вытанчаныя ўпрыгажэнні, стыльны макіяж і дарагія духі забяспечаць ёй усеагульнае захапленне і імклівае прасоўванне па службе.

Дарэмна стараецеся: мужчынская брацыя настолькі захоплена працай, што наўрад ці зверне ўвагу, чым ад вас пахне: «Шанэль № 5» або «Красной Москвой». Ну не заўважаюць яны дробязяў — у гэтым асаблівасць іх, мужчынскай, псіхалогіі. «Тануць» у дэталях — жаночая «прывілея».

Дарэчы, псіхолагі заўважылі: пастаянна знаходзячыся ў цэнтры ўвагі, жанчына моцна перажывае па прычыне свайго знешняга выгляду — і атрымлівае стрэс. Што ж да адзення, то ўсякія кофтачкі з рушамі, сукенкі, не кажучы ўжо пра міні-спадніцы, уздзейнічаюць на «падкорку» калег супрацьлеглага полу раздражняльна. Калі ўсе мужчыны ў касцюмах, а дама — у сукенцы з дэкальтэ, то яна будзе выглядаць чужой на іх «свяце жыцця». Хоць атрымаць запрашэнне на кубачак кавы можа…

**Спосаб выжывання.** Паспрабуйце змяніць свой гардэроб так, каб у вашым уборы абавязкова прысутнічалі якія-небудзь асобныя элементы мужчынскага адзення. Неабавязкова штаны, няхай гэта будуць пінжак, камізэлька або шыйная хустка, якая імітуе гальштук.

**Ілюзія другая.** Сапраўдныя мужчыны ведаюць: жанчына — істота слабая. Таму яны ўсяляк падстрахоўваюць дам на «крутых паваротах», своечасова падаюць руку і абараняюць ад лютых нападак шэфа.

Насамрэч, як толькі вы пераступілі парог «мужчынскага кветніка», для сваіх новых калег вы памерлі як слабая істота. Ніхто не будзе спісваць вам промахі, выціраць слёзы, ніхто не прыме ў разлік, што ў вас бываюць мігрэні і да т. п. Могуць і груба адказаць, і зрабіць некарэктную заўвагу. І справа зусім не ў тым, што мужчыны — бестактоўныя і цвердалобыя, а проста такія правілы гульні ў мужчынскай камандзе: жорсткая барацьба, дзе ёсць пераможцы і пераможаныя, і абавязковы прыз — грошы або кар'ерны рост.

Таму жанчына ў мужчынскім калектыве — не слабае звяно, а раўнапраўны гулец. А што здарыцца з дамачкай, якая апынулася на «полі бою» і не ўлічыла гэтае правіла? Яна прайграе.

**Спосаб выжывання.** Станьце камандным гульцом, даказаўшы свае прафесійныя здольнасці. Калі вы будзеце на працоўным месцы балбатаць па скайпе або гуляць у «Шчаслівую ферму», а праз дзень завaліце гадавую справаздачу, мужчыны вам гэтага не даруюць. Таму праявіце сябе першакласным спецыялістам, дакажыце ўсім, што вы ас у сваёй галіне. І тады павага мужчын да вашай персоны гарантавана.

**Ілюзія трэцяя.** Варта жанчыне пакакетнічаць, і ўсе адразу кінуцца да яе заляцацца, а хтосьці, магчыма (чым чорт не жартуе?), прапануе руку і сэрца.

Шукаць сужэнца на працоўным месцы — справа амаль бесперспектыўная. Прадстаўнікоў мужчынскага брацтва, здзічэлых без жанчын, «акруціць і захамутаць» гэтак жа складана, як манахаў з мужчынскага манастыра. Разгадка гэтай з'явы простая: на службе мужчын як людзей, нацэленых на поспех, перш за ўсё хвалюе тое, наколькі вы будзеце карыснымі ў працы, а ўжо потым (з 13.00 да 14.00 або пасля 18.00) — вашы астатнія якасці. Калі ж паненка ўмее толькі вочкамі страляць, то ёй прысвояць тытул «Міс… курыныя мазгі», а потым і зусім выправадзяць: маўляў, ты проста лішняя дэталь…

**Спосаб выжывання.** Адмоўцеся на працы ад какецтва, флірту. Не варта вам і з шэфам заігрываць — вы аўтаматычна станеце ворагам у калектыве. Пра службовыя раманы напісана столькі, што мусіраваць гэтую тэму нават не хочацца. Калі сітуацыя напальваецца, то часцей за ўсё звальняюць жанчыну.

**Ілюзія чацвёртая.** Даме, якая трапіла ў мужчынскі калектыў, лепш адразу забыцца пра тое, што яна — жанчына. Жорсткая бой-баба — вось адзіная правільная роля, якая дазволіць пацягацца сіламі з гэтымі каварнымі мужчынамі.

Вы, вядома ж, можаце пераняць іх стыль паводзін, «накачаць» мускулы, коратка падстрыгчыся і нават навучыцца гаварыць басам, тым не менш «сваёй» сярод мужчын не станеце. Проста яны дзесьці на падсвядомым узроўні адчуваюць: жорсткі агрэсіўны стыль для жанчыны — чужы, ненатуральны.

**Спосаб выжывання.** Выкарыстоўвайце абаянне. Акрамя ўмення працаваць у камандзе, жанчына павінна не забываць пра сваё, пра жаночае… Прырода ўзнагародзіла нас адной якасцю, якая дазволіць пакласці на лапаткі любую шкодную асобіну мужчынскага калектыву. Мы, жанчыны, умеем выпускаць нейкія флюіды, падобныя на ўльтрагукі, якія падаюцца матылькамі. Гэтая «субстанцыя» завецца абаянне. Ніхто з мужчын яго не бачыць, але ніводны з іх не ў сілах яму супрацьстаяць.

**Ілюзія пятая.** Калі на вас павысіў голас калега, маўчаць нельга — гэта ўшчамляе вашы правы. Трэба адквітацца той жа манетай або… расплакацца — няхай крыўдзіцель пакутуе ад згрызот сумлення.

Псіхолагі заўважылі: жанчыны вельмі крыўдлівыя і злапамятныя. Мужчыны ж пабіліся, нагаварылі адзін аднаму гадасцяў, памірыліся і, паціснуўшы рукі, разышліся. Дамы ж могуць гадамі памятаць колкія словы калег і ў думках ім помсціць (а нярэдка і ў рэчаіснасці). Гэта не толькі шкодзіць іх эмацыянальнаму здароўю, але і часам разбурае кар'еру.

**Спосаб выжывання.** У мужчынскім калектыве пакрыўдзіць словам — нармальная з'ява. І ад жанчыны чакаецца тое ж, што і ад мужчыны,— пасля прымірэння ўсё забыць і дараваць. Ды і ўвогуле, няпісанае правіла жыцця мужчынскага калектыву такое: паказаў эмоцыі — прайграў. Таму злавацца нельга. Дастаткова адказаць спакойным тонам, але з грознымі ноткамі — гэта заўсёды дзейнічае на моцны пол працвераажальна.

**Ілюзія шостая.** Мужчыны — істоты, абсалютна не прыстасаваныя да жыцця. Таму, трапіўшы ў мужчынскі калектыў, жанчыне трэба стаць ім… маці.

**Спосаб выжывання.** Ні ў якім разе не бярыце на сябе ролю мамачкі, якая і піражкамі накорміць, і выслухае ў цяжкую хвіліну, і збегае па мінералку, калі ў кагосьці здарылася пахмелле. Памятайце: праца і сям'я — зусім розныя рэчы. Кожнага з вашых калег дома чакае і маці, і жонка, і сястра. Вось яны і накормяць яго піражкамі. Няхай усё застаецца на сваіх месцах: піражкі — дома, а на працы — справы. Ваш мацярынскі інстынкт можа паслужыць для большасці раздражняльным фактарам, і вашы калегі або паспрабуюць пазбавіцца ад яго, або, наадварот, проста сядуць вам на шыю, і вы па жыцці будзеце ў іх «хатняй гаспадыняй» на працоўным месцы. А падобных клопатаў вам і дома хапае.

**Ілюзія сёмая.** Паколькі мужчыны — людзі справы, яны будуць толькі ўдзячныя за каштоўныя ўказанні, якія кампетэнтная дама раздае направа і налева.

Жанчына імкнецца параіць, накіраваць, засцерагчы няўмелых мужчын ад памылак. Так у яе рэалізуецца ўсё той жа мацярынскі інстынкт. Але чамусьці мужчыны ў адказ злуюцца. Чорная няўдзячнасць? Не, проста вы сваімі паводзінамі як быццам паказваеце на іх некампетэнтнасць. Адсюль рэзкае непрыманне.

**Спосаб выжывання.** Не варта адкрыта ўказваць мужчыну на яго памылкі і промахі, асабліва ў прысутнасці іншых супрацоўнікаў — гэтым вы наўрад ці даб'яцеся павагі да сябе. Калі вы заўважылі няправільна запоўнены дакумент або няўдала складзены план, пачакайце, пакуль застанецеся з калегам сам-насам, і ветліва прапануйце ўнесці карэктывы.

**Ілюзія восьмая (апошняя).** У мужчынскім калектыве складана прыжыцца. Гэтыя насупы і задзіры на кожным кроку так і намагаюцца падкалоць і даць зразумець, што жанчына — істота другога гатунку.

Зразумела, быць адзінай жанчынай у калектыве — цяжка. Але ж і прыемна — толькі ўявіце сабе, колькі падарункаў і знакаў увагі вы будзеце атрымліваць 8-га Сакавіка! У астатні час, вядома, будзе складана, аднак не варта апускаць рукі: мы ж з вамі дакладна ведаем, што жанчынам усё падсілу.

Дарэчы, паводле прагнозаў футуролагаў, у мужчынскім свеце XXI стагоддзя выжыве «жанчына-хамелеон», якая ўмее хутка пераключацца: у залежнасці ад сітуацыі можна будзе іграць ролю то баявой сяброўкі, то мудрай жанчыны і быць гатовай, калі трэба, ператварыцца ў «яно». А якую ролю ў якім выпадку «выбраць», падкажа ваша шостае пачуццё.

**Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ**

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3» –

**продавец (организатор аукциона) 18 декабря 2013 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества со снижением начальной цены на 50%**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Административное здание<br>Котельная<br>Весовая<br>Трансформаторная подстанция<br>Асфальтовое покрытие<br>Станция пожаротушения<br>Сети газоснабжения<br>Сети газоснабжения<br>Забор из ж/б плит | 287 371 179 | г. Чаусы, ул. Красноармейская | 28 737 000 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: **ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.**

2. Дата, время и место проведения аукциона: **18.12.2013 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.**

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества от 28.05.2009 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Информация о земельном участке: Площадь земельного участка – 2,3868 га, кадастровый номер – 725450100001000287.

5. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: Региональная Дирекция № 600 ОАО «БПС-Сбербанк» р/с 301211924 код 369, УНП 700049607, ОКПО 03454762.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 17.12.2013 г.; время: 17.00.**

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

9. Извещения о проведении открытых аукционов по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газетах «Звязда» № 169 от 10.09.2013 г., № 213 от 13.11.2013 г.

---

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «МинскСортСемОвощ» (223017, Минский район, а/г Гатово)

**по решению наблюдательного совета Общества СОСТОИТСЯ В ОЧНОЙ ФОРМЕ 24 декабря 2013 года.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об уменьшении уставного фонда ОАО «МинскСортСемОвощ».
2. О внесении изменений в Устав ОАО «МинскСортСемОвощ».
3. Об утверждении суммы отвлечения денежных средств на выплату временных финансовых займов работникам Общества.
4. Об утверждении Положения об оказании материальной помощи и дополнительных льготах работникам и неработающим пенсионерам ОАО «МинскСортСемОвощ».

Место проведения собрания: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 (актовый зал).

Начало собрания: 09 часов 00 минут.

Время регистрации участников — в день проведения собрания с 8 часов 30 минут до 8 часов 55 минут по месту проведения собрания.

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания — с 9 до 16 часов в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 16 декабря 2013 года, по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 17 декабря 2013 года.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности

УНН 600052664

*Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»*

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

**Предмет аукциона № 1,** в состав которого входит следующее имущество:

| № п/п | Наименование имущества | Инвентарный № |
|---|---|---|
| 1. | Автозаправочная станция (асфальтобетонное покрытие, навес, контейнер – операторская, ливневая канализационная сеть, резервуар аварийного слива 25 м.куб., контейнеры хранения топлива 30 м.куб., топливораздаточные колонки) | БТП00017 |
| 2. | Здание офиса, площадь – 71,3 кв.м, земельный участок с кадастровым № 425650100001000310 | 443/С-603 |
| 3. | Здание СТО, площадь – 102,3 кв.м, земельный участок с кадастровым № 42650100001000313 | 443/С-1240 |
| 4. | Изолированное нежилое помещение (топочная м оборудованием), пом. № 43, площадь – 22,0 кв.м, 1 этаж | 500/D-7058483 |
| 5. | Изолированное нежилое помещение, площадь – 32,6 кв.м, пом. № 24б, 1 этаж | 500/D-707998050 |
| 6. | Изолированное нежилое помещение, площадь – 96 кв.м, пом. № 24, 1 этаж | 500/D-707998048 |
| 7. | Изолированное нежилое помещение (подвал), пом. № 2, площадь – 55,1 кв.м. | 500/D-1005206 |
| 8. | Изолированное нежилое помещение, пом. № 37, площадь – 12,0 кв.м, 3 этаж | 500/D-1005220 |
| 9. | Изолированное нежилое помещение (подвал), пом. № 38, площадь – 77,6 кв.м | 500/D-1005221 |
| 10. | Б/У Распылитель шпаклевки НЕМО 10 | БТП00045 |
| 11. | Б/у Штукатурная станция Путцместер П13Е, сер. № 13900100285 | БТП00049 |
| 12. | Штукатурная станция ШС-4/6 (СО-49П) | БТП00481 |
| 13. | Штукатурная станция ШС-4/6 (СО-49П), | БТП00480 |
| 14. | Штукатурная станция ШС-4/6 (СО-50Д) | БТП00483 |
| 15. | Штукатурная станция ШС-4/6 (СО-50Д) | БТП00482 |

Ознакомиться с имуществом, входящим в предмет аукциона, можно по следующим адресам: местонахождение порядковых номеров 1–3 предмета аукциона: Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Ленина, 109; местонахождение порядковых номеров 4–9 предмета аукциона: г. Минск, ул. Лынькова, 63; местонахождение порядковых номеров 10–15 предмета аукциона: Минский район, д. Подгорье, гараж ОАО «Минский моторный завод».

Порядковые номера 1–9 предмета аукциона обременены договорами аренды со сроком действия 27.01.2014.

Начальная цена предмета аукциона – 3 866 759 000 (Три миллиарда восемьсот шестьдесят шесть миллионов семьсот пятьдесят девять тысяч) белорусских рублей.

Сумма задатка (10% от начальной цены предмета аукциона) – 386 675 900 (Триста восемьдесят шесть миллионов шестьсот семьдесят пять тысяч девятьсот) белорусских рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от начальной цены реализуемого с торгов предмета аукциона.

Продавец имущества – СООО «Белтранспрогресс» (220124, г. Минск, ул. М. Лынькова, 63, комн. 306, тел. (029) 682 29 62).

Организатор аукциона – управляющий по делу о банкротстве СООО «Белтранспрогресс» Общество с ограниченной ответственностью «ТОП БИЗНЕС АЛЬЯНС» (220116, г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501, тел. (029) 682 29 62).

Собственник имущества – СООО «Белтранспрогресс» (220124, г. Минск, ул. М. Лынькова, 63, комн. 306, тел. (029) 682 29 62).

Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе на р/с 3012000058099 в ОАО «Белгазпромбанк», код 742. Получатель – СООО «Белтранспрогресс», УНП 600495820.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в торгах со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором торгов день и время, указанные в извещении о проведении торгов. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в торгах.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества без учета НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) в течение 1 (Одного) месяца со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному частнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (Пять) процентов.

Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (покупателем) помимо оплаты стоимости предмета аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов и отказаться от его проведения.

**Аукцион проводится 09 января 2014 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 63, каб. 306. Заявления и документы подаются, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 16 декабря 2013 года по 27 декабря 2013 года включительно в рабочие дни с 11.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104, каб. 501. Срок окончания подачи заявлений – 27.12.2013 г.**

**Телефон для консультаций и справок: (029) 682-29-62.**

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Борисовдрев» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом**

## здания специализированного культурно-просветительного и зрелищного назначения,

